Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 37 (451) | Нядзеля, 5 лістапада 1939 года | Цана 20 кап.

НЯХАЙ ЖЫВЕ XXII ГАДАВІНА ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў СССР!



ЛОЗУНГІ ЦК ВКП(б)

да XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі

1. Няхай жыве XXII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР!

2. Братам па класу, вязням капітала, барацьбітам за вызваленне рабочага класа ва ўсім свеце—наша брацкае прывітанне!

3. Узмоцнім інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам капіталістычных краін! Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці! Няхай жыве пролетарскі інтэрнацыяналізм!

4. Няхай жыве мудрая знешняя палітыка совецкага ўрада, якая забяспечвае мір і бяспечнасць нашай радзімы!

5. Няхай жыве наша родная Чырвоная Армія, магутны аплот мірнай працы народаў СССР, верны страж заваяванняў Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі!

6. Няхай жыве Ваенна-Марскі Флот СССР—надзейная ахова марскіх граніц нашай радзімы!

7. Няхай жыве магутная совецкая авіяцыя! Няхай жывуць совецкія лётчыкі—гордыя сокалы нашай радзімы!

8. Прывітанне мужным і бясстрашным байцам-пагранічнікам, зоркім часавым краіны соцыялізма!

9. Баявое прывітанне доблесным байцам, камандзірам і палітработнікам гераічнай Чырвонай Арміі, вызваліўшым народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў!

10. Няхай жывуць вызваленыя народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, поўнапраўныя члены вялікай брацкай сям'і народаў Саюза ССР!

11. Няхай жыве адзіны украінскі народ, з'едналы ва Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы!

12. Няхай жыве адзіны беларускі народ, з'едналы ў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы!

13. Царская Расія была турмой народаў. У совецкай краіне расце і мацнее саюз роўнапраўных народаў. Няхай жыве саюз і дружба народаў СССР!

14. Няхай жыве брацкае супрацоўніцтва рабочых, сялян і інтэлігенцыі нашай краіны!

15. Няхай жыве Канстытуцыя нашай краіны, Канстытуцыя перамогшага соцыялізма і сапраўднага дэмакратызма!

16. Няхай жыве блок комуністаў і беспартыйных на выбарах у Советы дэпутатаў працоўных!

17. Многамільённай арміі стаханаўцаў прамысловасці, транспарта, гандлю і сельскай гаспадаркі, знатным людзям нашай краіны — палкае большэвіцкае прывітанне!

18. Прывітанне стаханаўцам соцыялістычных палёў, якія па-большэвіцку змагаюцца за высокія ўраджаі! Няхай жыве заможнае і культурнае жыццё калгасаў і калгаснікаў!

19. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі цяжкай індустрыі! За высокую здабычу вугалю, нафты, метала!

20. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі машынабудаўніцтва! Змагайцеся за развіццё самага перадавога машынабудаўніцтва ў свеце!

21. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі абароннай прамысловасці! Мацуйце абаронную магутнасць нашай радзімы! Узбройвайце Чырвоную Армію і Чырвоны Ваенна-Марскі Флот навейшай тэхнікай!

22. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі паліўнай і энергетычнай прамысловасці! Большэвіцкімі тэмпамі рухайце наперад здабычу паліва, вытворчасць электраэнергіі!

23. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі лёгкай прамысловасці! Больш паркалю, шоўку, сукна, трыкатажа, абутку грамадзянам совецкай краіны! Змагайцеся за паляпшэнне якасці прадукцыі!

24. Работнікі совецкага дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю! Змагайцеся за лепшае абслугоўванне совецкага спажыўца, за культурны совецкі гандаль у горадзе і вёсцы!

25. Служачыя совецкіх устаноў! Змагайцеся за ўмацаванне дзяржаўнай дысцыпліны, за акладнае выкананне совецкіх законаў, дабівайцеся ўзорнага задавальнення запросаў і патрэб працоўных!

26. За далейшы росквіт культуры народаў СССР, за новыя поспехі і заваяванні совецкай навукі, тэхнікі і мастацтва!

27. Узнімом культурна-тэхнічны ўзровень рабочага класа да ўзроўню работнікаў інжынерна-тэхнічнай працы!

28. Няхай жыве роўнапраўная жанчына СССР, актыўная ўдзельніца ў кіраванні дзяржавай, гаспадарчымі і культурнымі справамі краіны!

29. Штодзенныя клопаты аб рабочых і служачых, выхаванне ўсёй масы членаў профсаюзаў у духу ленінізма,—пачотны абавязак совецкіх профсаюзных арганізацый! Няхай жывуць совецкія профсаюзы—школа комунізма!

30. Працоўныя СССР! Не забывайце аб капіталістычным акружэнні, умацоўвайце нашу соцыялістычную разведку, дапамагайце ёй карчаваць ворагаў народа!

31. Шырэй разгорнем крытыку нашых недахопаў! Умацуем яшчэ больш магутнасць і арганізаванасць соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян!

32. Няхай жыве комсамол—верны памочнік большэвіцкай партыі! Няхай жыве працоўная моладзь нашай радзімы!

33. Навучаючыяся совецкай школы! Комсамольцы і комсамолкі! Піонеры і піонеркі! Авалодвайце ведамі, рыхтуйцеся стаць барацьбітамі за справу Леніна—Сталіна!

34. Няхай жыве і мацнее наша магутная радзіма—Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

35. Няхай жыве наш пабеданосны рабочы клас!

36. Няхай жыве наша пабеданоснае калгаснае сялянства!

37. Няхай жыве наша соцыялістычная інтэлігенцыя!

38. Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў—передавы атрад працоўных СССР!

39. Няхай жыве Комуністычны Інтэрнацыянал—арганізатар барацьбы супроць імперыялістычнай вайны, супроць капіталізма! Няхай жыве комунізм!

40. Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна! Няхай жыве ленінізм!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў).

* * *

Унечарговая Пятая Сесія Вярхоўнага Совета СССР першага склікання

ЗАКОН

АБ УКЛЮЧЭННІ ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ У САСТАЎ САЮЗА СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК СА З'ЕДНАННЕМ ЯЕ З УКРАІНСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, заслухаўшы заяву Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Украіны, ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Задаволіць просьбу Народнага Сабрання Заходняй Украіны і ўключыць Заходнюю Украіну у састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, са з'еднаннем яе з Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

2. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета назначыць дзень выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР ад Заходняй Украіны.

3. Прапанаваць Вярхоўнаму Совету Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прыняць Заходнюю Украіну ў састаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

4. Прасіць Вярхоўны Совет Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прадставіць на разгляд Вярхоўнага Совета СССР праект разграніччэння раёнаў і абласцей паміж Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
1 лістапада 1939 года.

ЗАКОН

АБ УКЛЮЧЭННІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў САСТАЎ САЮЗА СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК СА З'ЕДНАННЕМ ЯЕ З БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, заслухаўшы заяву Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Задаволіць просьбу Народнага Сабрання Заходняй Беларусі і ўключыць Заходнюю Беларусь ў састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік са з'еднаннем яе з Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

2. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета назначыць дзень выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР ад Заходняй Беларусі.

3. Прапанаваць Вярхоўнаму Совету Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

4. Прасіць Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прадставіць на разгляд Вярхоўнага Совета СССР праект разграніччэння раёнаў і абласцей паміж Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
2 лістапада 1939 года.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА САЮЗА ССР аб узнагароджанні Армянскага Дзяржаўнага Тэатра оперы і балета імені А. А. Спендзіарава і Армянскай Дзяржаўнай Філармоніі

За выдатныя заслугі ў развіцці тэатральнай і музыкальнай культуры і выхаванні нацыянальных мастацкіх кадраў узнагародзіць:

ОРДЭНАМ ЛЕНІНА:

Армянскі дзяржаўны тэатр оперы і балета імені А. А. Спендзіарава.

ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА:

Армянскую дзяржаўную філармонію.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
4 лістапада 1939 года.

Узнагароджанне удзельнікаў дэкады армянскага мастацтва

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР за выдатныя заслугі ў справе развіцця армянскага тэатральнага і музыкальнага мастацтва ўзнагароджан рад удзельнікаў дэкады армянскага мастацтва.

Ордэнам Леніна ўзнагароджаны — артыстка Дзяржаўнага тэатра оперы і балета імені А. А. Спендзіарава, заслужаная артыстка Армянскай ССР **А. Б. Даніэлян**; мастацкі кіраўнік дэкады армянскага мастацтва, народны артыст РСФСР **Р. Н. Сіманаў**; кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Армянскай і Грузінскай ССР **А. Т. Цігранян**; кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтва Армянскай ССР **А. І. Хачатуран**.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджана 26 чалавек.

Ордэнам «Знак Почета» 55 чалавек.

Медалью **«За трудовое отличие»** 49 чалавек.

ЯКУБ КОЛАС.

ВОЛЬНАМУ НАРОДУ

Спета, таварышы, панская песня.
Кончана з панам, пан не ўваскрэсне,
У край наш не знойдзе дарог.
Вольным народам сталі вы сёння.
Вашы ўсе пожні, вашы ўсе гоні,
І шлях вам, як сонца, пралёг.

Дружна-ж да працы, тверчая воля,
Вольная сіла, ясная доля,
І новыя песні складай.
Многа работы, многа разгону.
Гэй-жа наперад, люд вызвалёны.
Наперад, Совецкі мой край!

3/XI-39 г.

СВАБОДНАЯ ПЕСНЯ

Здарова, таварышы! Доўга чакалі
Мы вас і чакала ў няволі зямля.
Не раз углядалі я ў сінія далі,
Не раз выхадзілі да сонца на шлях!
Пра вас нам песні склаталіся пчыра
І колас у полі засмягшы звінеў,
І кожнай вясною, вітаючы ў шыры,
Лавілі ўсходняга ветру напеў.
Начамі паўзлі да калючага дроту,
Якім нас хацелі на век аддзяліць,
Ірвалі яго, звалі вас на палмогу. —
Вы: дарагія. пачулі прышлі,
Над краем этапных дарог і курганаў,
Над сінімі стужкамі блудзячых рэк,
Над хатамі, дзе яшчэ ўчора ў тумане
Сцягалася ўсё гурганнё на начлег,
Свабодная песня, парваўшая сілле,
З напевам арлоў — самалётаў звініць.
Здарова, шырокія зоркія крылі,
Прынёсшыя радасць і новыя дні!
Сягоння цымбалы не будуць больш
плакаць.
Вясна загасціла за сталам у нас.
Ад сэрца мы шлем сваё шчырае дзякуй
Сцягам, і байцам, і паслаўшаму вас.

МАКСІМ ТАНК.



XXII ГАДАВІНА ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

Лікаванне народнае апранула зямлю па вясенняму ў кветкі. Шчасце народнае сонцам сагрэла зямлю. Ад Буга да Ціхага акіяна палымнеюць чырвоныя сцягі і песні радасці, як вясеннія птахі, ляцяць з неабдымных прастораў совецкай зямлі да рубінавых зор Крэмля. Святкуе адзіная сям'я 183-мільённага, магутнейшага ў свеце совецкага народа. Надыйшоў дзень слаўнай XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

22 годы таму назад пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна рабочы клас у саюзе з бяднейшым сялянствам назаўсёды звергні панаванне эксплаататараў у нашай краіне, узялі ўладу ў свае рукі, устанавілі дыктатуру пролетарыята, — стварылі совецкую дзяржаву. Кастрычніцкая рэволюцыя паказала працоўным усяго света адзіна верны шлях да вызвалення.

22 годы пад кіраўніцтвам мудрай партыі Леніна—Сталіна совецкі народ будуе сваё шчаслівае соцыялістычнае жыццё.

Пад сцягам Леніна, пад кіраўніцтвам вялікага прадаўжальніка справы Леніна—таварыша Сталіна совецкі народ цвёрдым поступам ідзе наперад, к поўнаму таржаству комунізма.

І выдатнейшымі поспехамі, гістарычнымі падзеямі, якія залатымі старонкамі, велічнымі датамі ўваходзяць у гісторыю чалавецтва, сустракае наша радзіма XXII гадавіну Вялікага Кастрычніка.

Натхнёна працуе, расце і мацнее совецкая краіна. Умножыліся рады стаханаўцаў на заводах. Ліквідавана апошняя язва, пакінутая праклятым капіталістычным мінулым, — хутаршчына. Новыя рэкорды ўраджаю далі калгасныя палі.

Гераічныя сыны совецкага народа — воіны Чырвонай Арміі пакрылі сябе новай неўвядаемай славай, вызваліўшы народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад панскага гнёту, ад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Совецкі народ выканаў сваю гістарычную місію, працягнуўшы руку дапамогі братам-беларусам і братам-украінцам — Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.

І напярэдадні XXII гадавіны Кастрычніка Унечарговая Пятая Сесія Вярхоўнага Совета СССР прыняла гістарычныя Законы — задаволіла просьбу Народных Сабранняў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі і ўключыла Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь у састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

22-гі год Кастрычніка разбіў назаўсёды ланцугі панскага ўціску, што скоўвалі нашых братоў, і назаўсёды з'еднаў у брацкую совецкую сям'ю народы украінскай і беларускай зямлі.

Яшчэ шырэйшыя сталі плечы нашай соцыялістычнай радзімы, яшчэ дужэйшым стаў наш вялікі совецкі народ.

Значныя змяненні адбыліся і ў знешнім становішчы. «Дзякуючы паслядоўнаму правядзенню сваёй мірнай знешняй палітыкі нам удалося значна ўзмацніць свае пазіцыі і міжнародную вагу Совецкага Саюза». (В. Молатаў). Устаноўлены дружаскія адносіны між СССР і Германіяй. Заключаны пакты ўзаемадапамогі, якія маюць буйнейшае палітычнае значэнне, паміж СССР і прыбалтыйскімі суседзямі — Эстоніяй, Латвіяй і Літвой. Унечарговая Пятая Сесія Вярхоўнага Совета СССР аднадушна адобрыла мудрую знешнюю палітыку совецкага ўрада. І ўвесь совецкі народ горача вітае і падтрымоўвае гэта рашэнне Сесіі. Спакойна і ўпэўнена ўступае ў 23-ці год Кастрычніцкай рэволюцыі магутны Совецкі Саюз.

Лікуе беларускі народ. У Мінску і ў Беластоку, у Віцебску і ў Гродна, у Гомелі і ў Брэсце — над Дняпром і над Бугам, па ўсім абшары беларускай зямлі гучаць адны песні — песні шчасця, услаўляючы геній правадыра — любімага настаўніка і друга народаў вялікага Сталіна.

Назаўсёды пакладзен канец раз'еднанню беларускага народа. З'едналы ў адну дзяржаву, адной совецкай сям'ёй сустракае беларускі народ XXII гадавіну Кастрычніка — свята таржаства ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, свята Сталінскай дружбы народаў Совецкага Саюза.

У адзіным парыве ўдзячнасці і любові да вялікай соцыялістычнай радзімы, да партыі Леніна—Сталіна выходзяць на Кастрычніцкую дэманстрацыю ўпершыню вольна, упершыню шчасліва — працоўныя совецкай Заходняй Беларусі.

Сталіну славу,
Прывет і любоў
Шле ўздыхнуўшая вольна зямля.

У XXII гадавіну Кастрычніка выдатныя поспехі соцыялістычнай працы, натхнёнай творчасці дэманструе народ Совецкай Беларусі.

Колькі ярчэйшых дасягненняў толькі на такім участку культурнага будаўніцтва, як мастацтва. У гэтым годзе ажыццёўлены пастаноўкі першых беларускіх опер, а дзень XXII гадавіны Кастрычніка адзначаецца паказам першага беларускага балета «Салавей».

У рэпертуар драматычных тэатраў увайшла не адна таленавітая п'еса беларускіх драматургаў—«Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка, «Над Бярозай-ракой» П. Глебкі, «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы. Шмат новых твораў напісалі кампазітары. Вялікую выстаўку «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці» плённа рыхтуюць мастакі.

Мае чым ганарыцца на пачэсным Кастрычніцкім аглядзе і наша літаратура.

Новыя хвалюючыя вершы народных паэтаў—ордэнаносцаў Я. Купалы і Я. Коласа, новыя творы ордэнаносцаў З. Бядулі, М. Лынькова, П. Броўкі, П. Глебкі і многіх іншых паэтаў і пісьменнікаў узбагацілі літаратуру. А ў дні баёў з бандамі былой польскай арміі, у дні вызвалення Заходняй Беларусі пісьменнікі БССР здолелі давесці, што іх агнявое слова адданых совецкіх патрыётаў таксама зброя вызваліцельніцы народаў—Чырвонай Арміі.

XXII гадавіну Вялікага Кастрычніка совецкі народ сустракае ў час разгортвання кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Совецкі народ рыхтуецца на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі абраць у мясцовыя органы ўлады сваіх лепшых сыноў і дачок.

З вялікай актыўнасцю і ўздымам разгортваецца выбарчая кампанія, якая будзе новым трыумфам сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Лікуючы шчаслівы беларускі народ адзінай совецкай сям'ёй выходзіць на дэманстрацыю, каб выказаць сваю гарачую любоў і бязмежную адданасць партыі Леніна—Сталіна, яе Цэнтральнаму Камітэту, совецкаму ўраду, вялікаму Сталіну.

У 23-ці год свайго росквіту ўступае наша радзіма. Новыя гераічныя справы, цудоўныя перспектывы творчасці і працы —наперадзе. Асветлен сонцам комунізма шлях.

Няхай жывуць вызваленыя народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, поўнапраўныя члены вялікай брацкай сям'і народаў Саюза ССР!

Няхай жыве XXII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР!

Няхай жыве мудрая партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве любімы правадыр народаў таварыш Сталін!

Няхай жыве адзіны беларускі народ, з'еднаны ў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы!

★ ★ ★

ГРОДНА

Шляхта не хацела здаваць горад. Яна не адважылася сустрэцца ў адкрытым баі з чырвонымі войскамі, падпаліла мост цераз Нёман і засела ў казармах, у касцёлах, у старым замку... Будынкі гэтыя засталіся сведкамі трапных стрэлаў чырвоных танкістаў, — большасць танкавых снарадаў трапляла ў вокны, праз якія страляла труслівая шляхта.

Трусасць — не адзіная якасць іхнай істоты, — яны былі і злыя. Злыя той агіднай злобай бяссілля, якая ўласціва толькі тым, хто канчаткова і бясслаўна гіне.

Уцякаючы з горада, яны пры дапамозе некаторых настаўнікаў гімназіі ўзброілі вінтоўкамі шляхецкіх нашчадкаў — гімназістаў і паслалі іх рабіць пагромы...

Распачлівая злоба шляхцюкоў не мела мяжы — яны выразалі языкі і выкалвалі вочы сваім салдатам — яўрэям...

Гісторыя ніколі гэтага не забудзе, а вольныя народы Заходняй Беларусі ніколі ім гэтага не даруюць.

Калі на вуліцы ачышчанага ад шляхецкай зграі горада спыніўся чырвоны танк, а з яго вышаў чалавек у чырвонаармейскім адзенні і з шырокай усмешкай на прывабным твары, тады пачалі адчыняцца склепы і сутарэнні і вызваленыя ад гвалту і знішчэння людзі з вачамі, напоўненымі слязьмі радасці, бегі дзякаваць сваіх збавіцеляў.

Так гэты старажытні рускі горад распачаў сваё новае жыццё.

⁂

Шляхецкім «гісторыкам» не хацелася згадзіцца, што Гродна, ці, як яго раней называлі — Гародня — старажытні рускі горад. Яны прабавалі фальсіфіцыраваць гісторыю. Яны даводзілі, што летапісы, у якіх гаварылася аб княжанні сына Давіда Ігаравіча — Усевалода і дзяцей яго Барыса, Глеба і Мсціслава тычацца Гародні не на Нёмне, але княжаства Гродненскага, якое нібы існавала побач з Тураўскім на Палессі. Так яны гаварылі, але гістарычныя помнікі — гэтыя тысячагадовыя сведкі — абвяргалі іх.

У прадмесці Гродна на Каложы стаіць Барыса-Глебская царква XI стагоддзя — сведка высокай для таго часу візантыйскай культуры, прынесенай сюды рускімі, якія асelі тут, выцесніўшы зусім пазней загінуўшае племя яцьвягаў.

Шляхецкія «археолагі» пачалі раскопкі наўкол царквы і нават рэстаўрацыю самае царквы, але пераканаўшыся, што гэтыя работы толькі абвяргаюць іх імкненне давесці спрадвечную польскасць Гродна, — закансервіравалі работы на Каложы.

І стаіць старажытная, складзеная з пляскатых цаглін з упаянымі ў іх шліфаванымі аграмаднымі валунамі і кафельнымі чатырохкантовымі крыжамі, царкаўка... Стаіць і чакае сапраўдных совецкіх археолагаў, якія прачытаюць на яе мурах, па ўмураваных галасніках, па надпісах на афарных каменнях, па касцях пахаваных у ёй нябожчыкаў, па керамічных плітках падлогі, прачытаюць гісторыю царкаўкі — гісторыю культуры і развіцця старажытнага Гродна.

⁂

Прыгожа нясе Нёман свае празрыстыя воды, такія празрыстыя, што на любой глыбіні праз іх відаць дно.

А на абодвух берагах гэтай тысячы разоў апетай беларускім народам у сваіх спевах ракі раскінуўся па горах горад.

Шмат барочнай архітэктуры ўпрыгожваюць гэты чысценькі, тысячу год будаваны і тысячу разоў перабудоўваны горад.

Горад гэты не падобны на іншыя беларускія гарады: і ў архітэктуры, і ў азеляненні, і ў чыстых, роўных вуліцах — ва ўсім гэтым выяўляецца своеасаблівы твар горада. А зараз ён набыў і сваю душу.

Першы раз за тысячагоддзе войска прынесла гораду не агонь і смерць, але ратунак і вызваленне.

І горад урачыстуе і радуецца. Радуюцца яўрэі, што можна выйсці на вуліцу і не баяцца, што іх будуць біць ці здзекавацца, радуюцца рабочыя скураных заводаў і фабрыкі дыхты, што пазбавіліся ад жорсткай эксплаатацыі прадпрыемцаў; радуюцца беспрацоўныя з закансервіраванай сернікавай фабрыкі, бо ведаюць, што фабрыка адажыве ў совецкіх руках, а разам з ёй адажывуць і яны, — зноў стануць за ачышчаныя ад пылу і іржы варштаты.

⁂

У заасадзе, абмежаваны цэментным бар'ерам, пахмурна ходзіць па вытаптанай сталёвымі капытамі пляцоўцы магутны зубр «Грозны».

Аб чым думае гэты шыракалобы волат, патрасаючы сваёй кароткай чорна-бурай барадой?

Якія ўспаміны, якая прага жыве пад гэтым чэрапам, пакрытым бурай грывай?

І гледзячы на яго, мімаволі ўносішся думкай да тых старадаўніх часоў, калі табуны гэтых магутных звяроў таптalі сталёвымі капытамі сцежкі ў непраходных пушчах і агалошвалі магутным ровам лясныя абшары ці то ўцякаючы ад праследвання славутых паляўнічых часоў Уладзіміра ды Яраслава, ці то кідаючы долу ды топчучы няўдалага праследвальніка ці лясного звера.

Сілай, нязмернай сілай і магутнасцю патыхае ад стройнай постаці волата-зубра. Побач з ім леў траціць сваю гордую прыгожасць і сваёй параўнальнай мізэрнасцю выклікае яшчэ большае захапленне зубрам.

М. ІЛЬІНСКІ.



Ленінградскі мастак-баталіст І. А. Уладзіміраў закончыў карціну «Сяляне Заходняй Беларусі вядуць пад канвоем польскіх афіцэраў». **На здымку: карціна мастака І. А. Уладзімірава.**

★ ★ ★

Вершы паэтаў Заходняй Беларусі

ПАСЛЯ ПРЫСУДУ

Сэрца, не кіпі! Я не, — не сплю —
Лячу ў прадонне нябыцця.
Прадонне, не шапчы,
Што я, загінены, цярплю —
Ты лжэш! Маўчы!
Бо я іду
па шумнай дарозе жыцця!
Ціха на дне — цемра — імгла —
Распластай крыллі, віхар,
І пенны накіп аж да тла
Узрымі маім вулканным дыхам!
Хваляў шум — буруны —
Натоўпу вал, як гоман пушчы,
Ці то кляскочуць бунту струны?
Ці маяк свой зор прыплюшчыў
І мару-волю даў на штурмы?
Прапала песня,
— А, гэта ты
З натоўпу блiснула усмешкай.
Што шэпчаш мне? Дрыжаць лісты,
Лапочуць над маім падстрэшшам.
— Шляхам бярозы без краю
Просяцца даллю: «пастой», —
Ціхія зоры іграюць,
Клічуць — завуць у прастор.
— «Не спявай. Знаю — люблю.
Не плач. У дрыжачых струнах песень
не згублю».
— Хто шумы бору распеніць,
Зволіць народу турму?
Хто прыласкае цярпенні,
Хто прыгалубіць зямлю?
— Цярпеннем мост будую туды, дзе
спеліцца краса,
На бераг той ракі, а там — вясна.
Там па дарожках жабрачых
Вехі лахманных надзей
У полі бярозкамі плачуць —
Болем народных грудзей.
— На ложку астрожным ляжу
прыкаваны,
Распяты, бунтуюся ў сне,
І сочацца кроўю, гараць мае раны —
За мной, прад мною гадоў чараду
Ночка астрожная лічыць пры мне —
Бывай,
пайду!
Вачай прамені, да гары!
Маяк гарыць
над морам пенным —
Пружынься, крок мой, цвёрда!
Шумі,
паход —
Хто-ж галаву падыме горда,
Каб узыйсці на эшафот?
Гары, у кім песні не астылі,
У паходах-штурмах на Бастылію!

Лукішкі. 1936. **ФІЛІП ПЕСТРАК.**

ЗА КУДЗЕЛЯЙ

Эх, мая доля, доля дзяўчыны,
Цяжка застацца адной!..
Помню — кахала, казаў — не пакіну...
Скулі, забралі вясной.

Слёзы, слёзы... век не плакаць,
Свішча вецер у начы..
Каб хоць кажуць тонка прасці,
Верацяна, гэй, скачы!

Жала я жыта летам у полі,
Гнулася раць каласоў,
Блутаўся вецер у с ім прыволлі,
Мілы ка мне не прыйшоў...

А я жала жыта, жала,
Сэрца плакала ў начы...
Маці скажа — не напрала,
Верацяна, гэй скачы!

Жоўтымі лісцямі сеяла восень
Хмары за хмарай плылі,
Гойдаўся вецер на соннай бярозе,
Часам канаў у галлі...

Можа вярнецца з астрогу
Мілы, рана ці ўначы,
Пацалую я мілога. —
Верацяна, гэй скачы!

Зноў і зіма прыблукалася знекуль,
Пухам заткала прастор,
Свечкай мароз пачапіўся за страхі,
Клеіць на шыбах узор.

Ды не плач у полі вецер,
Гэтак жаласна ў начы,
Можа міленькі ўжо едзе, —
Верацяна, гэй, скачы!

1937 г. **Ніна ТАРАС.**

НІВА

Ціха калышуцца жыта палоскі,
Поўзаюць хвалі адна за адной...
— Жыта, надзея галоднае вёскі,
Дзеткі худзенькія просяць—паспей!..

Вецер калоссе, дурноніk, паблытаў,
Клоніць-схіляе к зямельцы сырой.
— Хутка паспею!..—зашастала жыта,
І замірае той шэпт за гарой.

А дзетвары заварожаней спіцца:
Новенькім хлебам набіт жываток...
Эх, бо і лета ідзе за вясніцай —
Хлеба-ж, прызнацца, не бачыў ніхто.
І выбягаюць часценька на ўзгорак
З ціхай мальбою галодных вачэй,
Ручкай схіляюць калоссе ў разоры,
Хлебным цяжарам каб звісла хутчэй.
Выбеглі сення — і, бедным, здалося,
Вырваўшы з сэрца і крыўду і крык,
Што вырастае хутчэй, чым калоссе,
Хлебная смага ў збалелым нутры.
Спей-жа на радасць, каханае жыцца,
Зернем тугім налівайся, буйней,
Каб перавяслам навекі здружыцца
З доляй і сэрцам затужаных жней.
Бацька сярпы навастрыў і назубіў,
Дадзіць-майструе пустое гумно:
Хоча аджыць хоць надзеяй-загубай,
Чорныя згадкі схаваўшы на дно.
...Копы растуць, набухаючы стогам,
Троіцца ў думках прывет умалот...
Толькі — ці-ж зерня таго залатога
Хопіць — каб голад засыпаць на год?
І не смяецца, не цешыць прыволле
Заўтрашнім святам пажатых палос,
І запалоньвае сэрца ўсё болей
Жаўранак песенным россыпам слёз.
Цені прабеглі — і ніва, як вечар,
З жытніх прастораў трывога брыдзе
І засланяе тугой чалавечай
Светлае ранне мужычых надзей.

Вільна—Лукішкі.
1936. **В. ТАУЛАЙ.**

★ ★ ★

Лёс мастака

Я нарадзіўся ў мястэчку Сухаднёў у вельмі беднай і набожнай сям'і. Яшчэ ў дзяцінстве я захапляўся разьбою па дрэву. Але перашкодай было тое, што мае набожныя бацькі лічылі гэта святатацтвам і праследвалі мяне на кожным кроку.

Аднойчы я глыбока, да косці, парэзаў сабе палец. Вялікая была радасць бацькоў. Яны сталі крычаць, што «ён цяпер ужо ніколі не возьме нажа ў рукі!» Але якое вялікае было іх расчараванне, калі я ў гэты-ж вечар зноў узяўся за любімую справу.

Так я днямі, гадамі выразаў па дрэву розныя рэчы: шахматы, даміно. У трынаццаць год ад роду я вельмі палюбіў выразаць розныя фігуры. Свае вырабы я хаваў у яме, каб бацькі не маглі іх спаліць.

Я так захапіўся гэтай працай, што аднойчы ў суботу, калі бацька лёг спаць, я дастаў ножык і пачаў выразаць фігурку з дрэва, нібы на свеце і суботы не было. І я не заўважыў, што ўсё гэта бачыць бацька. Але на гэты раз ён ужо мяне больш не біў, як гэта было заўсёды. Ён гаварыў мне ціха, але вельмі сурова. Ён даў мне зразумець, што я павінен зараз-жа пакінуць яго дом, што я нават не магу тут пераначаваць. І ў гэты-ж вечар я паклаў усе мае фігуркі ў мяшок і пайшоў бадзяцца па свету.

Я рабіў розную работу—удзень зарабляў сабе на хлеб, а ўвечары займаўся разьбою. Так дабрыў я да Варшавы. Тут я дабіўся спаткання з вядомым мастаком Куна і паказаў яму маю працу. Ён зацікавіўся. Мяне прынялі ў Варшаўскую мастацкую акадэмію. Вось тут і пачынаецца для мяне страшэннае пекла. Будучы амаль няграматным, не маючы ніякіх сродкаў на пражыццё, ды ў дадатак з'яўляючыся яўрэем, я павінен быў выконваць усякую цяжкую работу, каб толькі мець магчымасць вучыцца ў мастацкай акадэміі. Я працаваў для ўсялякіх шарлатанаў, бяздарнікаў. Я высякаў для іх розныя фігуры з граніта, дрэва, і ўсе мае работы яны выдавалі за свае. Друк пра іх пісаў як пра таленавітых мастакоў, якія змаглі адолець такі матэрыял, як граніт. Так я працаваў, не маючы часу займацца ў акадэміі.

Час ад часу я кідаў гэтую працу і пераходзіў у акадэмію, каб зрабіць штонебудзь з натуры. Але гэта было не надоўга. Голад зноў кідаў мяне на пошукі працы.

У 1923 годзе я цяжка захварэў на сухоты, валяўся то ў бальніцы, то ў санаторыі. Крыху паправіўшыся, я ствараю сваю работу «Сухотнік», за якую атрымаў на выстаўцы першы прыз. Затым я ствараю па дрэву рад рэчаў, партрэтаў, з якіх многія былі адзначаны на розных выстаўках.



«Старая Беларусь»—эскізная работа самавучкі настаўніка сярэдняй школы м. Смалявічы тав. **Мазо.**

Фота І. Каплінскага.

Аднак, не гледзячы на гэта, жыццё рабілася для мяне ўсё больш цяжэйшым і цяжэйшым і з прычыны маёй хваробы і з прычыны шалёнага антысемітызма. Бачыў я, што я тут лішні.

Але я ствараў. Мне здаецца, што я штосьці зрабіў, бо я многа думаў і многа працаваў. Але я нікому не паказваў маёй работы і вырашыў пайсці туды, дзе буду патрэбен, дзе народ сапраўды любіць мастацтва. А гэты народ — народ вялікага Савецкага Саюза.

Давід ПФЕФЕР.

г. Пінск.

Хвалюючыя сустрэчы

Брыгада Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР паказала працоўным Заходняй Беларусі спектакль «Гершэле Остропэлер» і канцэртную праграму. Брыгада наведала гарады Баранавічы, Пінск і Кобрын. Радасна сустракалі працоўныя прыезд брыгады. Задоўга да пачатку спектакля ці канцэрта збіраліся натоўпы гледачоў. Дзверы тэатра даводзілася зачыняць толькі тады, калі ў зале не заставалася ні крышачкі вольнага месца. Дарэчы, усе глядзельныя памяшканні гэтых гарадоў запушчаныя, няўтульныя. Сцэнічныя пляцоўкі вельмі прымітыўныя і ўбогія. Няма акторскіх грыміровачных.

Усе спектаклі брыгады тэатра прайшлі з выключным поспехам. Гледачы бурна і доўга апладыравалі не толькі пасля сканчэння акта. Апладысменты і крыкі «ура» прарывалі акторскую ігру і ў сярэдзіне актаў. Было абслужана 12500 гледачоў. Вялікую работу правяла брыгада сярод выбаршчыкаў і ў дзень выбараў у Народнае Сабранне 22 кастрычніка гэтага года.

З асаблівым уздымам прайшлі спектаклі ў Пінску. Глядзельны зал быў запоўнен рабочымі фанернай і запалкавай фабрык. У часе спектакля з глядзельнага зала несліся воклічы: «Няхай жыве совецкае мастацтва!», «Няхай жыве наша вызваліцельніца доблесная Чырвоная Армія!». Кожны спектакль ператвараўся ў хвалюючую сустрэчу прадстаўнікоў нашай мастацкай інтэлігенцыі з працоўнымі Заходняй Беларусі.

М. КАГАН.

ПІСЬМЕННІКІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Сход мясцовага настаўніцтва Беластока. Новы тэатр, досыць прыгожы і ўмясціцельны, яшчэ не паспеў набыць нашага совецкага выгляду: ён нейкі цемнаваты і халодны. Адчуваецца халадок раздум'я і ў публіцы. І ўсё-ж прарываюцца новыя веянні.

Стары яўрэй абыходзіць фае з дочкамі. Ён першы раз у тэатры, яму хочацца каму-небудзь сказаць пра гэта: «Раней баяўся я праходзіць нават міма тэатра: мяне-б збілі толькі за тое, што я яўрэй», кажа ён нібыта дочкам, адрасуючы свае словы нам—совецкім людзям. Дзіўная справа: паміж намі і тымі, каго радуе вызваленне, адчуваюцца ўсюды нявідныя для вока струны сваяцтва: яны ў зваротах, у жаданні пагаварыць, у поглядах, ва ўсмешках. Мы — родныя, свае, таварышы. Гэтыя нявідныя для вока сувязі пачынаюць праяўляцца на сцэну, калі адчынілася заслона. Прабіваючыся праз халадок сумненняў і раздум'я, пацягнуліся яны к Якубу Коласу, калі ён пачаў гаварыць аб пачатку сваёй настаўніцкай дзейнасці калісь тут-жа, на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Усё мацней і мацней адчуваеш, як растапліваецца лядок сумнення, калі аратары гавораць аб дарозе, якую прайшла інтэлігенцыя ў Совецкім Саюзе, як зніклі сумненні ў старой інтэлігенцыі, як высока пастаўлена наша сучасная інтэлігенцыя. І тады выходзіць звычайны польскі настаўнік і пачынае перабіраць у памяці ўсе крыўды і здзекі, якія ўлады чынілі над настаўнікамі, над прафесарамі, над студэнтамі. Ён называе рад прозвішчаў, вядомых усёй польскай інтэлігенцыі, ён з абурэннем пытаецца, за што іх выкідвалі з кафедр, з школ, з універсітэтаў? Ён прыводзіць сцэны жудаснага унтэр-прышыбееўскага свавольства над тымі, хто, нават будучы абсалютна лаяльным да гранадскага ладу Польшчы, хацеў паслужыць сур'ёзнаму несці святло навукі народу. Халодны чыноўнік, казённы патрыёт, а не энтузіяст-асветнік патрэбен быў польскім уладам. Пачатковая школа ў бруднай сялянскай хаціне—вось і ўся шчодрасць польскай дзяржавы для рабоча-сялянскай моладзі.

«Чаго мы жадаем—ісці назад да пачатковай школы ці да універсітэтаў для ўсіх? Ісці ў цемру чыноўніцтва ці да высокай грамадзянскай свядомасці. Ісці служыць пану, які зневажае нас, ці служыць народу, які імкнецца ўсёй душой да святла і заклікае нас прыйсці яму на дапамогу?» І зала дружна адказвае: «Ідзем к святлу з цемры!» З месца ўздымаецца маладая настаўніца-практыкантка. Хвалюючыся і збіваючыся, яна расказвае, як дасталася ёй вышэйшая адукацыя ў Польшчы, як стоячы ў кутку студэнты-яўрэі набывалі асвету, як па 3 годы бясплатна «практыкавалі» скончыўшыя універсітэт, бо хацелася працаваць, а працы не давалі. Не, дзяржава, якая так скоўвала жыццё грамадзян—не мела права на існаванне і яна зусім заканамерна іскаваць перастала.

⁂

Гладкая, хаця і вузкая дарога прыводзіць нас у Гродна. Абапал дарогі — пудоўныя маладыя бярозкі ў залатых уборах лістапада. Па баках і наперадзе — узгоркі, пакрытыя затканымі восенню дыванамі лясоў і пералескаў. Чырвоныя плямы клёнаў, рудыя сарочкі дубоў і золата бяроз ярка вылучаюцца на цёмна-зялёным аксаміце хвоі, ствараючы самыя прыгудлівыя ўзоры на гэтым гігантскім дыване. Вось і Гродна. Яшчэ не залечаны раны баёў Чырвонай Арміі з афіцэрскай бандай, труслiва збегшай з поля боя і засеўшай у горадзе, каб ратаваць шляхецкі гонар яўрэйскім пагромам. Вось з акна вежы, відаць, палівалі яны совецкія танкі кулямётным агнём. Але не пашчасцілася панам афіцэрам: снарад танка трапіў як-раз у падакенніцу, на якой ляжала дула кулямёта. Так і хочацца адправіць гэта вакно вежы ў ваенны музей, як экспанат меткасці стральбы совецкіх танкістаў.

На беразе Нёмана — развалiны сцен старажытнага замка, круглыя точаныя каменныя ядры, старадаўняя царкаў з мазаічнымі крыжамі ў сценах. Усё гэта — праца беларускіх сялян, усё гэта — майстэрства народных беларускіх майстроў. Прастаяла яна многія сотні год, перажыла многа акупацый і чужаземных панаванняў, каб зноў вярнуцца народу ў якасці музейных рэдкасцей ужо для ўсенароднага карыстання.

Я не буду апісваць спатканне інтэлігенцыі г. Гродна з пісьменнікамі. Пра гэта пісалі нашы газеты. З найвялікшай увагай слухалі гродзенцы змястоўны і красачны даклад Змітрака Бядулі, выступленні паэтаў і пісьменнікаў. Горача, па-совецку, апладыравалі кожнаму выступленню. З захапленнем спатыкалі і праводзілі ленінградскіх артыстаў, ад душы вітаючы росквіт совецкага мастацтва.

⁂

У Гродна мы пазнаёміліся з цікавым беларускім пісьменнікам Філіпам Сямёнавічам Пестраком. Ён 11 год прасядзеў у польскай турме і толькі прыход Чырвонай Арміі вызваліў яго з адзіночкі. 11 год ён не меў ні паперы, ні алоўка. Складаў свае вершы напамяць і завучваў іх, ходзячы па камеры, каб мець магчымасць калі-небудзь, калі выйдзе на волю, пераказаць іх чытачу. Радкі вершык, запісаны алоўкам на папяроснай паперы, вырываўся з сцен турмы і з'яўляўся ў друку пад подпісам П. Звястуна. Зараз тав. Пестрак успамінае і запісвае свае вершы. Праўда — няма часу. Работы па горла — і робіць ён яе з вялікай любоўю і з нястомнай энергіяй, бо ажыццяўляе тую справу, якой аддаў усё сваё жыццё, у тым ліку і сваю творчасць.

«У дэфензіве», «Пасля прысуду», «Восень» — такая тэматыка Пестрака. З надзвычайнай дасканаласцю перадае ён чалавечыя думы і пачуцці ва ўсіх іх адценнях: і трывожныя думы асуджанага, і ўспаміны аб таварышах, з якімі рука ў руку прыходзілася змагацца супроць панскага ладу, і ўспаміны аб блізкіх сэрцу людзях, і прагу жыцця і волі. Але не волі, купленай пакорай і здрадай, а волі заваяванай, вырванай з рук катаў для ўсяго народа. І ціхі голас паэта (прывычка, якую паняволі прышлося набыць за 11 год турмы), падымаецца да звонкага голасу трыбуна, калі Пестрак чытае свае вершы — заклікі да народа.

Тут-жа каля Гродна пражывае другі таленавіты беларускі паэт Міхась Васілёк (Касцевіч). Нажаль, нам не ўдалося ўбачыць яго, затое мы пазнаёміліся з яго зборнікам «З сялянскіх ніў». Невялічкі зборнічак, любоўна выданы Рыгорам Раманавічам Шырмай — беларускім этнографам. Тав. Шырма запісаў каля 2.000 народных песень Заходняй Беларусі, ён — арганізатар і кіраўнік беларускага хора ў Вільна.

Зборнічак густа перасечан цэнзурнымі кропкамі. Відаць, скрыгочучы зубамі, даваў цэнзар дазвол на яго друкаванне два годы таму назад, спадзяючыся, што жандарская ўправа ўсё-ж перахопіць кніжку яшчэ да выхаду ў свет. Асноўным матывам зборніка з'яўляецца — будзіць веру народа ў свае сілы.

Вера ў той час, калі «ў сям'і народаў і беларускі народ не будзе лішнім», калі сумныя песні пад панскім прыгнётам заменяцца «песнямі радасці вольнае працы», калі на магілы загінуўшых змагароў за волю народа прыдуць з ружжамі вольныя і пераможшыя «браты-таварышы», калі сялянская ніва дасць уволю хлеба — гэтай верай прасякнута ўся творчасць Васілька. І ў гэтым асноўная каштоўнасць яго творчасці.

Васілёк — селянін вёскі Бабровня. Польская жандармерыя прыдумала спецыяльна для яго, як «хлопскага» паэта, спосаб адвучыць пісаць беларускія вершы: яна данімала яго штрафамі, як селяніна, з д'ябальскім вынаходніцтвам выдумляла яна гэтыя штрафы. Але ні турма, ні штрафы не запужалі таленавітага паэта. І ён дажыў да тых часоў, калі спраўдзіліся яго мары — беларускі народ скінуў векавыя ланцугі панскай апекі.

Таксама праз зборнікі даведаліся мы яшчэ аб трох буйнейшых беларускіх паэтах: Наталіі Арсеньевай, Максіму Танку і Міхасю Машары. Усе яны выехалі з Вільна, але пакуль-што не трапілі ў буйныя культурныя цэнтры, а заселі на час у вёсках, і нашы пісьменніцкія брыгады не змаглі да іх даехаць, хаця вельмі гэтага жадалі. Прышлося адкласці гэта на другі прыезд — у недалёкім будучым. Нас вельмі абрадавала паведамленне тав. Шырмы, што ён вывез апошні зборнік Арсеньевай «Жоўтая восень», не трапіўшы яшчэ ў друк. Арсеньева з'яўляецца паэтычнай наследніцай Багдановіча, надзвычай моцным лірыкам. Яе вершы, па трапнаму выразу М. Танка, «расцвілі цудоўнай казкай» і «шумяць трысцём». Класавая барацьба была доўгі час чужой у гэтым свеце музыкі і чалавечых пачуццяў і толькі смутак і замалёўкі сумных пейзажаў даносілі да чытача любоў паэтэсы да свайго пакутуючага народа. У апошнім зборніку паэтэса больш выразна адклікаецца на пакуты народа, бліжэй падыходзіць да народа. Мы ўпэўнены, што яе ліра загучыць радасным прывітам народу вызваленаму, народу шчасліваму.

Зборнікаў вершаў Максіма Танка ў нас цэлых чатыры. Гэта надзвычай здольны і плённы паэт, які ад зборніка да зборніка ўдасканальвае сваё майстэрства. Ён вялікі майстар паэтычнага апасродкавання трапнай дэталі. Вершы яго насычаны глыбокай любоўю да чалавека, да сваёй краіны. Польская ўлада «ацаніла» яго талент: зборнікі яго былі канфіскаваны і сам ён трапіў у турму. Але і там не змаўкаў паэт.

З астатнімі беларускімі паэтамі амаль з усімі пазнаёміліся нашы брыгады ў Лідзе, у Пінску і ў Слоніме. Сярод іх асаблівую ўвагу выклікала маладая паэтэса Ніна Тарас. Яе вершы апроч выключна народнай мілагучнасці і прастаты вылучаюцца вялікімі мастацкімі абагульненнямі. І маці, якая перад галоднымі дзецьмі вылічвае на пальцах худых нядзелі да жніва, і беспрацоўная на бруку з дзіцянём, як жоўты, апаўшы восенню ліст, і дзяўчына за прасніцай з думамі аб мілым, якога каты пасадзілі ў Картуз-Бярозу — гэта не толькі трапныя, абагульненыя мастацкія вобразы, гэта смелае абвінавачанне ладу б. польскай дзяржавы кінутае рукой сапраўднага паэта-грамадзяніна. Ад душы радуешся, чытаючы вершы маладой паэтэсы, што яе таленту суджана развівацца ўжо ў нас, у свабоднай краіне.

У другі раз мы пазнаёмім вас з творчасцю здольных беларускіх паэтаў Таўлая, Іверса, Машары і другіх. Зараз мне хочацца намаляваць вам другую карціну. На вуліцах Беластока мы спаткалі людзей з клункамі за плячыма і кіямі ў руках. Гэта былі бежанцы з Варшавы. Сярод іх шмат яўрэйскіх пісьменнікаў: вядомы навеліст Кагановскі з жонкай, паэт Эмет Ізраіль, раманіст Гросман Майсей, нядаўна вышаўшы з турмы паэт Біном Геллер і дзесяткі другіх. Многія з іх пакінулі ў пылаючай Варшаве дзяцей. Там-жа засталася ўся іх маёмасць і нават рукапісы. Мы звязалі іх з часовымі ўпраўленнямі гарадоў, аказалі дапамогу, звязалі з рэдакцыямі газет. Усе пісьменнікі Заходняй Беларусі прынялі самы непасрэдны, самы жывы ўдзел у выбарах дэпутатаў Народнага (Нацыянальнага) Сабрання. Яны былі найлепшымі агітатарамі і арганізатарамі, нават тыя, якія толькі што прышлі ў горад і не мелі дзе начаваць. Яны адчувалі думы і мары народа і дапамаглі народу перавярнуць чорныя старонкі яго гісторыі, закрыць іх новымі, светлымі, шчаслівымі.

На што асаблівы голад сярод пісьменнікаў Заходняй Беларусі? На нашу совецкую кнігу, на творы класікаў марксізма, на совецкую літаратуру. Трэба ім у гэтым дапамагчы безадкладна.

М. КЛІМКОВІЧ.

ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ КУЛЬТУРЫ НАРОДАЎ СССР, ЗА НОВЫЯ ПОСПЕХІ І ЗАВАЯВАННІ СОВЕЦКАЙ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І МАСТАЦТВА!



На здымку: выступленне канцэртнай брыгады Тэатра юнага гледача на вуліцах Брэст-Літоўска. Фота С. Гуца.

М. КЛІМКОВІЧ

З ВЕРШАЎ АБ ЗАХОДНЯЙ ВЕЛАРУСІ

У ВЁСЦЫ

Вісяць рабінавыя веткі,
Як чырвань снягаў, над сялом,
Над кожнай аб'імшэлай стрэшкай,
Над кожным скрыўленым акном.
Ці гэта ў часе развітання
Аб любых сэрпу на ўспамін
Дзяўчаты ясным майскім раннем
Прыбралі вёску ў цвет рабін, —
І губы іх зачырванелі
У рабінных ягадах пасля
Ці спягам волі ў няволі
Тут запвіла сама зямля. —
Зямля, дзе ўсё паліта потам,
Крывёй і горкаю слязой...
Чыей вы сожжаны заботай.
Чыей узрошчаны рукой, —
Таго не ведаю, не знаю,
І ўсхвалёваны стаю,
І як жывых істот вітаю
Рабін чырвоную сям'ю.

Беласток. 20. X. 1939 г.

СЯБРЫ

Як я з Андрэем жыў-дружыў,
Таму калгас наш сведка.
Я зрубы звонкія рубіў,
Ён печы клаў на радкасць.

Рухавым, спрытным двум хлапцам
Вясёлым і упартым,
Давалася майстэрства нам
Не цяжка—так, між жартаў.

І што ўжо там крывіць душой —
Адчынена, не ўпотай,
Мы ганарыліся сваёй
І дружбай, і работай.

Бывала даджу я вянец.
Чалеснік ён вывозіць.
— Не падкачай, — крычу, — хлапец!
— Трымайся!—друг мне грозіць.

І я трымаўся, не качаў,
І з сотні хат, як лёду.
Ён без памылкі пазнаваў
Мае вуглы заўсёды.
Ды знаў і я — вядома рэч—
Не падвядзе ён друга.
І стрэўшы сам дзе-небудзь печ,
Красу на ўсю акругу,
Бывала перад ёй стаю,
І ў вачах пяшчота:
— Ну як-жа, як-жа, пазнаю —
Андрэева работа!
І чуткі між дзяўчат заўжды
Пра нас ішлі такія,
Што жаніхі мы хоць куды,
Што рукі залатыя.

Так, дзень за днём выдатна плыў.
На славу мы дружылі.
А гэтай восенню—прызыў,
Нам позвы уручылі.
Ну што-ж, мы рады чым хутчэй!
Жаданы дзень прыходзіць.
— Не падкачай, — крычу,—Андрэй!
— Трымайся!—друг мне грозіць.
Трымціць на клёне позні ліст,
Гусцее пазалота.
Таварыш мой артылерыст,
А мой род войск—пяхота.
Дарма, што поруч не ідзе
Са мной Андрэй, як калісь,
Я знаю, друг не падвядзе,
Хоць пасылай на полюс.
Надыйдзе дзень, зямля мая,
За лёс свайго народу,
Як бура, грозны ўстану я
Насустрач бандзе зброду.
І будзе бой — і жах, і зірок!
І вораг азвярэе.
Ды на падмогу нам здалёк
Ударыць батарэя.
Узніме галаву сваю,
Павесялеўшы, рота
А я ускрыкну: — Пазнаю—
Андрэева работа!
І вораг дрогне. І вятры
Развеюць дым і грукі.
І зноўку стрэнуцца сябры
Паціснуць моцна рукі.

АЛЕСЬ ЖАЎРУК.

РАДАСНЫЯ ДНІ

Брэст—наш старадаўні горад, які шырока раскінуўся на ўзбярэжжы цудоўнага Буга.

З захаду горад прыкрывае непрыступная гістарычная крэпасць—Брэст-Літоўск.

Брэст — адзін з буйнейшых чыгуначных вузлоў з 60-тысячным насельніцтвам. Але ні аб якім культурным абслугоўванні жыхароў ніколі не думалі нікчэмныя кіраўнікі былой панскай Польшчы. Адзінае ў горадзе тэатральнае памяшканне на другі-ж дзень пасля яго пабудовы было перадана афіцэрскаму клубу.

У Брэсце не было прафесіянальнага тэатра. Зрэдку, адзін-два разы ў год, прыязджалі гастралёры польскай аперэты. Але набыць білет было не лёгка: кошт яго раўняўся поўмесячнаму заработку рабочага хлебапякарні.

Памяшканне тэатра нагадвае вайсковую казарму. Глядзельная зала тэатра змяшчае 900 чалавек. Сцэна ўбогая. Пакояў для актораў няма.

Раптам мы пачулі чыйсьці ўзрадаваны голас:

— Міроша!

— Трэльскі!

І два таварышы кінуліся ў абдымкі. Завязалася жвавая гутарка сяброў, якія не бачыліся 25 год.

Старэйшы майстар беларускай сцэны Е. М. Міровіч расказаў свайму сябру пра шчаслівыя годы свайго жыцця, пражытыя ў Совецкай Беларусі, пра радасную творчую работу, якую забяспечыла Еўсігнею Афінагенавічу совецкая ўлада, узнагародзіўшы яго за выдатныя поспехі ў развіцці беларускага совецкага мастацтва званнем заслужанага артыста рэспублікі і ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР.

— А я гандляваў ліманадам, — ціха сказаў свайму старому сябру Андрэеў-Трэльскі,—забыў, мусіць, як трэба іграць на сцэне...

Вядомы аперэтачны рускі актор і рэжысёр Андрэеў-Трэльскі, каб не памерці з голаду, гандляваў у Брэсце ліманадам. Яго калегі працавалі час-ад-часу па малярнай справе, а другія і зусім былі беспрацоўнымі.

Вестка аб прыездзе ў Брэст совецкага тэатра — Тэатра юнага гледача БССР хутка абляцела горад. За дзве гадзіны да пачатку збіраўся народ перад тэатрам, каб хутчэй убачыць спектакль на роднай мове. І калі ўсе праходы, падваконнікі і сходцы былі запоўнены, пачынаўся спектакль «Цудоўная дудка» Віт. Вольскага.

Не меншая колькасць гледачоў, жадаючых убачыць спектакль, аставалася яшчэ на вуліцы.

Кожная рэпліка актораў, накіраваная супроць панскага гнёту, суправаджалася апладысментамі і крыкамі «ура». А калі ў апошняй дзеі п'есы сяляне пад кіраўніцтвам вясковага пастуха Янкі паўсталі супроць панскага ярма, лікаванню не было канца. Гледачы, забыўшыся, што яны ў тэатры, кідаліся да сцэны, каб дапамагчы акторам выгнаць паноў, якія прыйшлі разбураць вёску. П'еса-казка Вольскага «Цудоўная дудка» аб цяжкім мінулым беларускага народа яшчэ ўчора магла гучаць тут быллю, а сёння і тут гэта ўжо казка... І гледачы з пачуццём вялікай радасці выказвалі ўдзячнасць нашай слаўнай Чырвонай Арміі і паслаўшаму яе вялікаму совецкаму народу за вызваленне Заходняй Беларусі з-пад панскага ярма.

Мы расказвалі вучням аб шчаслівым жыцці і вучобе дзяцей Мінска, аб светлых сталінскіх школах, у якіх вучацца нашы дзеці, аб Палацы піонераў, тэатрах, дзе рабяты праводзяць свой адпачынак пасля вучобы. Дзеці прагна ловілі кожнае наша слова.

— Значыць і ў нас будзе так? — пытае ўсхвалявана дзяўчынка з 7-га класа. — І мы будзем так вучыцца, як нашы браты — дзеці ў Совецкай Беларусі?

Пасля гутаркі актары тэатра знаёмілі дзяцей з выстаўкай, прысвечанай жыццю і вучобе совецкіх школьнікаў.

22 кастрычніка калектыў Тэатра юнага гледача распачаў свае выступленне з 8 гадзін раніцы. Радасна і святочна выглядаў у гэты дзень Брэст. Радасна і велічна гучалі шчаслівыя і свабодныя словы песні. Канцэрты тэатра на ўчасткахператвараліся ў мітынгі дружбы народаў СССР і Заходняй Беларусі.

За час гастролей тэатра ў Брэсце, з 15 па 30 кастрычніка, было паказана 15 спектакляў і 16 канцэртаў для Чырвонай Арміі, насельніцтва і дзяцей. Тэатр абслужыў каля 30.000 гледачоў.

Падарожжа ў Заходнюю Беларусь натхняе калектыў тэатра на новыя творчыя поспехі на карысць нашага шчаслівага юнацтва.

В. СТЭЛЬМАХ.



ДЭКАДА АРМЯНСКАГА МАСТАЦТВА У ў МАСКВЕ. На здымку: выступленне Дзяржаўнага ансамбля армянскай песні і пляскі армянскай філармоніі. Танец «Вер-Верн».

МАСТАЦТВА АРМЯНСКАГА НАРОДА

Армянская культура адносіцца да ліку старажытнейшых культур. Выдатныя помнікі старасветчыны, прыгожыя архітэктурныя пабудовы, цудоўныя народныя легенды, песні, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне,—можна ўбачыць і пачуць у сонечнай Арменіі. Армянскі народ у VII—X ст.ст. нашай эры стварыў найвялікшую народную паэму «Давід Сасунскі», якая стаіць на адным узроўні з такімі сусветнымі паэмамі, як «Іліяда» і «Одысея». Але яшчэ ніколі за ўсе доўгія стагоддзі свайго існавання не ведаў і не перажываў армянскі народ і яго мастацтва такога росквіту, якога ён дасягнуў за годы існавання совецкай улады. Свае выдатныя поспехі і дасягненні ў галіне мастацтва армянскі народ прадэманстрыраваў на дэкадзе армянскага мастацтва ў сталіцы Совецкага Саюза—Маскве.

Дарэвалюцыйная Расія знаёмілася з армянскім тэатрам толькі праз асобных актораў, якія гастраліравалі па гарадах Расіі, Закаўказзя і Еўропы. Славутая армянская актрыса Сірануш, трагікі Адамян і Абелян—вось тыя нямногія, якіх ведала грамадскасць Расіі. XIX стагоддзе высоўвае ў Арменіі рад выдатных дзеячоў ва ўсіх галінах мастацтва. Паяўляецца выдатны драматург Габрыэл Сундукян са сваімі п'есамі «Пэпо», «Разоренный очаг» і інш. Паяўляецца выдатны армянскі сатырык Паронян, пісьменнік-драматург Шырванзадэ і, нарэшце, вялікі армянскі паэт Ованес Туманян, стварыўшы цудоўныя паэмы «Взятие Тмкаберта» і «Ануш». Гэтыя выдатныя паэмы і леглі ў аснову лібрэта опер «Алмаст» (музыка А. Спендзіарава) і «Ануш» (музыка А. Тыграняна), якія былі паказаны на дэкадзе армянскага мастацтва ў Маскве.

У канцы XIX стагоддзя паяўляецца геніяльны кампазітар Комітас, які з'яўляецца глыбокім знаўцам і збіральнікам народных мелодый. Паяўляюцца таксама выдатныя кампазітары, як Кара Мурза, Спендзіараў, Романос Мелікян, Спірыдон Мелікян і інш. Дастойнымі прэемнікамі багацейшай музычнай спадчыны, пакінутай гэтымі натхнёнымі творцамі, з'яўляюцца маладыя совецкія кампазітары, выхаваныя ў сценах нашых кансерваторый. Яны ўзбагачаюць і паглыбляюць цудоўную музыку армянскага народа, ствараюць новыя першакласныя музычныя творы. Сярод іх Аро Сцепанян, аўтар опер «Лусабацын», «Давід Сасунскі», «Храбры Назар», музычнай паэмы «26 камісараў» і інш. твораў; А. Хачатуран — тварэц першага армянскага балета «Шчасце» і аўтар рада іншых музычных твораў, сімфанічнай паэмы аб Сталіне і т. д.

Шырока вядомы армянскія ашугі. З асяроддзя ашугаў выйшлі выдатныя песняры і паэты, узбагаціўшыя сваёй творчасцю армянскую культуру. Гэта—Багдасар Дбір, Нагаш Овнантан, Саят-Нова, Джывані. Сучасныя совецкія ашугі Грыкор, Веоды, Есаўі кроўна звязаны з народам. Яны з'яўляюцца творцамі новых народных мелодый, песень аб Леніне, Сталіне, аб калгасным заможным жыцці. Квітнеюць культура і мастацтва Арменіі. У сталіцы Армянскай рэспублікі Ерэване працуюць: дзяржаўны драматычны тэатр імя Сундукяна, рускі тэатр імя Станіслаўскага, азербайджанскі тэатр, перасоўны дзяржаўны тэатр, тэатр юнага гледача, тэатр лялек. Упершыню ў гісторыі армянскага народа створан тэатр оперы і балета імя Спендзіарава. Час яго існавання—сем год, але ў рэпертуары тэатра ёсць ужо восем нацыянальных опер і тры балеты, з якіх тры оперы і адзін балет, якія адлюстроўваюць розныя перыяды з гісторыі армянскага народа, увайшлі ў рэпертуар дэкады.

У аснову оперы «Алмаст» (музыка Спендзіарава, лібрэта С. Парнок і Т. Ахумяна) пакладзена выдатная паэма Ованеса Туманяна «Взятие Тмкаберта». Гэта опера адлюстроўвае гераічнае мінулае армянскага народа ў яго барацьбе з іншаземнымі заваявальнікамі, яна напісана ў духу эпічнага сказання.

Спектакль «Алмаст» з'яўляецца дэбютам маладога рэжысёра Г. Ованесяна.

Вядучыя партыі гэтай оперы выконваюць маладыя таленавітыя акторы. Ролю князя Татула выконвае Павел Лісіцыян, ён дасканала вядзе партыю і стварае хвалюючы вобраз адданага радзіме і народу героя.

Ролю Алмаст, гэты складаны вобраз ганарлівай жанчыны, якая адчыняе вароты крэпасці ворагам, выконвае 23-гадовая комсамолка Татэвік Сазандаран, яркая адароная артыстка, валодаючая моцным голасам і вялікім тэмпераментам. Не менш добрая і другая выканальніца ролі Алмаст маладая артыстка Л. Авецісян.

Опера «Ануш» напісана па аднайменнай паэме О. Туманяна, музыка і лібрэта—засл. дзеяча мастацтваў Армянскай ССР А. Тыграняна. «Ануш»—гэта першая армянская опера. Яна рысуе быт і норавы дарэвалюцыйнай вёскі. Музыка оперы прасякнута народнымі мелодыямі, надаючымі ёй надзвычайную прастату і шчырасць.

Трэцяя опера, паказаная ў Маскве—«Лусабацын», першая армянская опера, напісаная на гістарычна-рэвалюцыйную тэму. Аўтар лібрэта Т. Ахумян, музыку напісаў заслужаны дзеяч мастацтваў, дэпутат Вярхоўнага Совета Армянскай ССР кампазітар Аро Сцепанян. Опера «Лусабацын» адлюстроўвае падзеі майскага паўстання 1920 года, накіраванага супроць дашнакоў, якія імкнуліся навязаць армянскаму народу волю армянскіх і іншаземных капіталістаў.

Надоўга запамінаецца цудоўная музыка гэтай оперы, насычаная народнымі мелодыямі. Незвычайна праўдзіва перададзены жывыя чалавечыя эмоцыі ў спалучэнні з высокім драматычным напружаннем.

Такім-жа выдатным творам з'яўляецца першы армянскі балет «Шчасце». Сама назва сведчыць аб змесце яго. У ім паказана шчаслівае заможнае жыццё калгаснікаў Совецкай Арменіі, іх любоў да сваёй радзімы, гатоўнасць абараняць совецкія рубяжы. Музыка балета напісана таленавітым кампазітарам А. Хачатуранам, вучнем Гнесіна і Мяскоўскага. У яго музыцы бліскуча спалучаюцца армянскія матывы з рускай і еўрапейскай музычнай культурай.

У Ерэванскім тэатры оперы і балета побач з вядучымі артыстамі старой школы, спевакамі А. Даніэлян, Шара Тальян, Л. Ісецкім, мастаком М. Сар'янам, дырыжорам К. Сараджавым, артыстамі балета Л. Воінавай-Шыканян, С. Полаўцавым вылучыліся маладыя таленавітыя артысты, выхаванцы совецкіх кансерваторый і харэаграфічных вучылішчаў. Сярод іх спевакі: Беджанян, Фенарджан, Хачатуран, Хачыкян, Ахзян, артысты балета: Паўлінэ Бурназян, Зэрэ Мурадзян, Абгаян і іншыя—у выкананні сваіх роляй дасягнулі выдатных поспехаў. Малады і таленавіты музыкант, галоўны дырыжор М. Таўрызіан здолеў выхаваць у салістаў і ў аркестры выдатнае пачуццё музычнага ансамбля.

Культура Арменіі не абмяжоўваецца адным тэатрам. Цудоўны ансамбль ашугскай песні, якім кіруе засл. дзеяч мастацтваў Шара Тальян, аркестр народных інструментаў пад кіраваннем кампазітара т. Мірзаян, джаз-аркестр, кіруемы засл. дзеячом мастацтваў А. Айвазянам, ансамбль песні і пляскі, харавая капэла пад кіраваннем Т. Алтуняна—сведчаць аб яркім квітненні армянскага соцыялістычнага мастацтва.

Усе гэтыя поспехі свабоднага армянскага народа дасягнуты ў цесным садружастве з усімі народамі брацкіх рэспублік пад геніяльным кіраўніцтвам правадыра народаў—вялікага Сталіна.

Г. АГБОЛЯН.

Нач. Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК Армянскай ССР.

ПАЧАТАК ЖЫЦЦЯ

Усе буйнейшыя гарады Заходняй Беларусі—Беласток, Брэст-Літоўск, Гродна, Баранавічы, Пінск не мелі сталых тэатральных труп. Сюды заязджалі час-ад-часу ўсякія перасовачныя трупы і групы актораў з аперэтачнымі спектаклямі, нізкапробнымі меладрамамі ці халтурнымі рэвю. Аб якой выканаўчай культуры можна гаварыць? Усё тое, што стала законам для любога раённага значэння совецкага тэатра — ансамбль у ігры, ідэйнасць рэпертуара, культурнае афармленне і г. д. — адсутнічала ў польскім тэатры.

Дастаткова паглядзець на тэатральныя будынкі Заходняй Беларусі, каб зразумець, як нядбайна, па-хамску адносіліся мясцовыя ўлады да тэатральнага мастацтва. Брудныя, абадраныя сукны з прарэзанымі дзіркамі, — для наглядання са сцэны за глядзельнай залай. Сцэны ў жудасным запусценні. Па размерах сваіх і абсталяванню яны зусім непрыстасаваныя для больш-менш складанай тэатральнай пастаноўкі. Характэрна, што нават у нэвапабудаваным тэатры ў Беластоку — адзіным прыстойным тэатральным будынку на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі — сцэна пазбаўлена кішэняў для дэкарацый. Брудныя клеткі — акторскія пакоі, адсутнасць рэпетыцыйных памяшканняў — вось вонкавая карціна становішча тэатральнага мастацтва ў Заходняй Беларусі. Вонкавасць упаўне адпавядае ўнутранаму зместу польскага тэатральнага мастацтва.

Праўда, у Варшаве былі культурныя тэатры, вельмі добрыя акторы. У варшаўскіх тэатрах, напрыклад, добра ведалі сістэму Станіслаўскага. Але бядзейшне аддзяляла сталічныя тэатры ад правінцыяльных. Паказны бляск у сталіцы, убоства і беднасць па ўсёй тэрыторыі дзяржавы — гэты, характэрны для ўсёй гнілой польскай дзяржавы прынцып існаваў і ў тэатры. Але нават і ў Варшаве не было добрай оперы, а драматычныя тэатры Варшавы не ведалі добрага новага рэпертуару. Драматургіі, якая хаця-б у якой-бы то ні было ступені праўдзіва адлюстроўвала з'явы сучаснага жыцця, Польшча не мела. Што ўжо гаварыць аб тэатры правінцыі? Іх рэпертуар быў запоўнен усялякай дрэбедзенню.

Лёгка сабе ўявіць, якое-ж было становішча рускага, беларускага, яўрэйскага, украінскага тэатраў на тэрыторыі былой Польшчы.

У Брэст-Літоўску быў рускі тэатр аперэты, які ў мінулым годзе быў забаронен. Кіраўнік тэатра вопытны актор Андрэеў-Трэльскі быў прымушаны прадаваць ліманад, каб не памерці з голаду. Жылі выпадковымі заробкамі і астатнія мясцовыя акторы. Руская трупа ў Вільна з цяжкасцю дабілася дазволу даваць два спектаклі ў месяц. На што-ж было жыць у астатнія дні месяца? Некаторыя імкнуліся паступіць у польскую трупу, але не ўсе маглі перамагчы свой рускі акцэнт, таму рускія акторы выходзілі статыстамі ў спектаклях польскага тэатра.

Малады совецкі актор, працуючы над такімі п'есамі, як «Без віны вінаватыя», «Лес» ці «Таленты і паклоннікі», вывучае па гістарычных матэрыялах быт і становішча старога акторства, апісанага Астроўскім, бо гэта для іх страшэнная гісторыя, якую ім цяжка ўявіць. Для рускага-ж актора ў былой Польшчы — гэта была рэчаіснасць.

Няма чаго і гаварыць, што яўрэйскі тэатр жорстка праследваўся. Польшча мела вялікіх яўрэйскіх актораў, але не мела яўрэйскага тэатра ў нашым разуменні гэтага слова. Зверскі праследваемыя і прыгнятаемыя яўрэйскія акторы былі пазбаўлены магчымасці ствараць тэатр-ансамбль, не мелі магчымасці развіваць свае дараванні. Цяжкае жыццё выпрацавала ў асяроддзі яўрэйскіх актораў надзвычайны антаганізм, групаўшчыну, што таксама, вядома, перашкаджала стварэнню сапраўднага яўрэйскага тэатра.

У Беластоку, у Гродна, у Брэст-Літоўску зараз сканцэнтрыраваліся вялікія групы яўрэйскіх актораў-бежанцаў з Варшавы, Вільна і інш. гарадоў. Сярод іх вялікія імёны — А. В. Марэўскі, Ida Каменская і інш. На прыкладзе Марэўскага можна праілюстрыраваць, якімі мыслямі і настроямі жыве зараз уся гэта вялікая група актораў. Марэўскі — актор і рэжысёр, які асабліва шмат працаваў над Шэкспірам. Калі ён гаворыць аб умовах, у якіх працаваў яўрэйскі актор у Польшчы, вы адчуваеце, якая велізарная рана ззяе ў грудзях у гэтага актора і як балюча дакранаецца да гэтай ззяючай раны. Лепшыя творчыя замыслы прыходзілася хаваць глыбока ў сабе, — вядома, нельга было і марыць аб іх ажыццяўленні. На кожным кроку маглі оплёваць, зняважыць, а ён не меў права пратэставаць. На сустрэчы з акторамі нашага Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра, якая адбылася ў Гродна, Марэўскі, між іншым, расказаў, як восем месяцаў таму назад ён прыехаў у Гродна з трупай, каб сыграць шэкспіраўскую «Буру» (роля Праспера ў «Буры», гавораць бачыўшыя, адна з вяршынь творчасці Марэўскага), але спектакль быў уладамі забаронен і яму прышлося выступаць у якойсьці бязглуздай музычнай буфанадзе.

Шмат год Марэўскі марыць аб пастаноўцы «Венецыянскага купца» Шэкспіра. Яшчэ ў 1933 годзе ім была напісана кніга «Шэйлок і Шэкспір», у 1937 г. яму ўдалося на ўласныя грошы выдаць яе ў Вільна. Гэта вострая палемічная кніга — незвычайная з'ява ў заходняй шэкспіралогіі. І совецкі тэатр можа пачарпнуць нямала цікавых назіранняў і мысляў у гэтай кнізе. Але як ажыццявіць свой замысел на сцэне? Пастаноўка патрабавала сродкаў, добрага тэатра. Ён ужо згубіў надзею ажыццявіць сваю мару. Цяпер ён ведае, што яна ажыццявіцца. І яшчэ шмат іншых вялікіх творчых замыслаў таксама ажыццявяцца.

— Вы ведаеце, у той дзень, калі я пачну рэпетыраваць Шэйлока, я напэўна буду доўга плакаць... Мне 53 годы. Я ўжо думаў, каб знайсці цёплы куток і чыстую падушку, дзе памерці... І раптам новае жыццё адкрылася перад намі. Новыя, нябачаныя гарызонты. Я забываю аб сваіх гадах. Ніколі мне не хацелася так многа і добра працаваць. Цяпер мы пакажам, на што мы па-сапраўднаму здольны.

Калі рускі і яўрэйскі тэатры праследваліся, дык беларускі быў зусім знішчан. Нават следоў яго не ўдаецца знайсці ў Заходняй Беларусі. Праклятыя польскія паны задавілі культуру беларускага народа. Вядома, у беларускім народзе былі спробы стварыць свой нацыянальны тэатр, але гэтыя спробы прасякаліся ў корані, ініцыятары-ж іх траплялі ў турмы. Мы ўпэўнены, што як толькі будзе абвешчана камплектаванне складу беларускіх драматычных тэатраў, знойдзецца шмат таленавітых людзей, якія гадамі марылі аб стварэнні нацыянальнага тэатра.

Мізэрным і ўбогім выглядае тэатральнае мастацтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Знаёмячыся з гэтым мастацтвам, ці быта робіш паездку ў далёкае мінулае. Як быццам не еўрапейская дзяржава гаспадарыла тут, а тупыя вандалы, якія з садысцкім захапленнем растоптвалі ўсякія парасткі сапраўднага мастацтва.

А гэта-ж таленавіты край! Адсюль выйшла шмат скрыпачоў з сусветным імем. І зараз у кожным горадзе сустракаеш выключна адароную моладзь, якая цяпер, трапіўшы ў совецкія ўмовы, вырасце ў вялікіх мастакоў. Цяпер кожны таленавіты чалавек будзе на вучоце, новыя таленты будуць раскрыты ў народзе, усе яны будуць клапатліва і цярпліва вырошчвацца совецкай дзяржавай.

Калі тут слухаюць аб пастаноўцы справы мастацтва ў Совецкім Саюзе, у людзей цяплеюць вочы і вырываюцца воклічы накшталт гэтакіх: няўжо гэта праўда? Як у казцы! І мы так будзем працаваць?

Клопаты дзяржавы аб мастацтве, патрабаванні высокай якасці ад самага маленькага раённага тэатра, блізкасць тэатра да гледача, маральна-бытавыя ўмовы актора, месяцы працы над новымі спектаклямі, вучоба ўнутры тэатральнага калектыва, поўнае вызваленне актора ад клопатаў аб зборах, аб дазволе на спектакль, — усё гэта напаўняе іх здзіўленнем і велізарнай радасцю, што і для іх скончыліся годы вандравання і здзекаў правячых колаў над мастацтвам, што цяпер іх самыя дзёрзкія замыслы атрымаюць ажыццяўленне і падтрыманне.

***

Прадстаіць велізарная работа па арганізацыі і выхаванню кадраў работнікаў мастацтваў Заходняй Беларусі, па арганізацыі там совецкай сістэмы мастацтваў. Акторам, рэжысёрам, музыкантам Заходняй Беларусі прыдзецца шмат у чым перавучвацца, ім прадстаіць авалодаць марксісцкім светапоглядам, асвоіць вопыт самай перадавой у свеце совецкай тэатральнай і музычнай культуры. Нашы таварышы з Заходняй Беларусі прагнуць вучыцца, прагнуць бліжэй азнаёміцца з нашым мастацтвам і яго майстрамі. Трэба ім у гэтым максімальна дапамагчы.

Трэба хутчэй пачаць творчую працу ва ўсіх калектывах, прадумаць усю сістэму вучобы новых кадраў мастацтва.

Стыхійна гэта праца пачалася з першых-жа дзён вызвалення Заходняй Беларусі.

Музыканты арганізоўваюцца ў сімфанічныя аркестры, мастакі правялі велізарную работу па афармленню гарадоў за дні выбараў у Народнае Сабранне, тэатральныя трупы рэпетыруюць п'есы: польская — «Мараль пані Дульскай», руская — «Без віны вінаватыя», яўрэйская — «Жыццё кліча» Біль-Белацаркоўскага (Чадава іграе Марэўскі, прэм'еру мяркуюць паказаць у дзень XXII гадавіны Кастрычніка), украінская — «Наталку-Палтаўку». Хутка распаўсюджваюцца совецкія песні, велізарным поспехам усюды карыстаецца «Родина» Дунаеўскага і іншыя совецкія песні. Словы песні: «Человек у нас имеет право на учебу, отдых и на труд» — прарываюцца заўсёды громам апладысментаў. Гэта зразумела. Хор, у выкананні якога мы слухалі «Родину», праспяваў да гэтага бясконца сумную, якая раніць душу, «Песню беспрацоўнага». Яна была добра знаёма аўдыторыі. Не толькі песня, але і беспрацоўе, але і галоднае жыццё без усякіх праваў, без усякіх перспектыў.

Велізарную актыўнасць праявілі брыгады мясцовых актораў, музыкантаў, мастакоў у дні выбараў у Народнае Сабранне. Звыш 20 канцэртаў далі брыгады актораў Брэст-Літоўска на выбарчых участках.

Часовыя ўпраўленні аказалі матэрыяльную дапамогу работнікам мастацтва і прынялі меры для ліквідацыі сярод іх беспрацоўя.

Польскія фашысты культывіравалі нацыянальную рознь, чалавеканенавісніцтва сярод работнікаў мастацтва. Цяпер гэтаму прышоў канец. Сімвалічным прагучаў пацалунак паміж рэжысёрам польскай трупы Чангеры і рэжысёрам яўрэйскай трупы Марэўскім, якім яны абмяняліся на праведзенай намі нарадзе рэжысёраў Гродна.

Калі ў Брэст-Літоўску ўпершыню ў адным канцэрце выступалі рускія, польскія і яўрэйскія акторы, шмат якія акторы з радасці плакалі...

— Быў я апалітычным чалавекам, — заявіў нам А. В. Марэўскі на выбарчым участку 22 кастрычніка. — Я аб'ездзіў шмат краін, але сёння я першы раз у маім жыцці галасую, бо сёння я ведаю, за каго і за што я галасую!

М. ЮДЗЛЕВІЧ.

Упершыню святкуюць вольна

З вялікім энтузіязмам і радасцю рыхтуюцца працоўныя Пінска да XXII гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

У дні, калі радыёстанцыя імя Комінтэрна разносіла па ўсяму свету кастрычніцкія маршы і песні, грукат танкаў і роў авіяматораў паветраных эскадрыллій, вітальныя воклічы дэманстрантаў у гонар вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна,—няміогія працоўныя Пінска асмельваліся ўключаць свае радыёпрыёмнікі і слухаць Красную плошчу. За гэта каралі турмой, катаргай, Картуз-Бярозай. І працоўным заставалася толькі марыць аб лепшым часе. Гэты час зараз надышоў.

Сотні людзей спыняюцца на гарадской плошчы і з цікавасцю сочаць за тым, як хутка вырастае святочная трыбуна, спрабуюць здагадацца аб тым для якой мэты будуюць высокія драўляныя пераплёты. З радасным здзіўленнем расказваюць, што часовае ўпраўленне сабрала ўсіх мастакоў горада і нават доўга з імі раілася і распрацавала план упрыгожання плошчы і цэнтральных вуліц. Яшчэ большае здзіўленне выклікае той факт, што часовае ўпраўленне стварыла брыгаду з беспрацоўных сталяроў, цесляроў, даручыла ім паводле эскізаў мастакоў упрыгожыць горад.

Мастакі Пінска ніколі яшчэ не працавалі над выкананнем такога буйнага заказа. Пад майстэрню аддзедзена самая вялікая зала ў памяшканні часовага ўпраўлення. У гэтай зале яшчэ два месяцы таму назад знаходзіўся акруговы суд, суд польскіх катаў. У гэтай зале яшчэ зусім нядаўна выносіліся здзеклівыя прысуды над рабочымі і сялянамі. А зараз там кіпіць творчая праца.

Мастакі Лаўроў, Муханаў, Петрэзаводскі, Власава і інш. працуюць над вялікімі партрэтамі Леніна, Сталіна, Молатава, Варашылава, — кіраўнікоў комуністычнай партыі і савецкага ўрада. На бакавых карыдорах будынка часовага ўпраўлення разасланы чырвоныя палотнішчы, на якіх мастакі пішуць лозунгі.

Аднак, падрыхтоўкай да свята заняты не толькі мастакі. У горадзе за кароткі перыяд работы часовага ўпраўлення створаны два хоры — рускі ў колькасці 30 чал. і яўрэйскі ў колькасці 22 чал., духавы аркестр у складзе 30 чал. і сімфанічны аркестр. Усе гэтыя мастацкія калектывы рыхтуюць совецкі рэпертуар, вывучаюць совецкія песні, каб выступіць перад рабочымі фабрык і заводаў у дні кастрычніцкіх свят.

Паводле традыцый совецкай краіны, у Пінску рыхтуюцца святочныя падарункі. Да 7 лістапада адкрыецца першая гарадская бібліятэка, укамплектаваная совецкай палітычнай і мастацкай літаратурай. Рабочыя запалкавай фабрыкі і фанернага завода (б. Лур'е) адкрыюць у дні свята клуб і дзіцячы сад. У кастрычніцкія дні будуць праведзены дзіцячыя ранішнікі, дзеці атрымаюць падарункі. У Пінск прыехала брыгада гомельскіх школьнікаў, якая прывезла з сабою 186 скрынак з падарункамі і кнігамі. Сярод падарункаў —патэфон з пласцінкамі, фотаапараты, цацкі, музычныя інструменты і г. д. Усё гэта будзе раздана дзецям працоўных, дзіцячым садам.

Кожнае з гэтых мерапрыемстваў, якое ў Совецкім Саюзе стала паўсядзённым, у Пінску глыбока здзіўляе і хвалюе. Клопаты аб працоўных і іх дзецях пашыраюцца і ахопліваюць усё новыя галіны.

Свята Вялікага Кастрычніка упершыню вольна правядуць працоўныя Пінска.

І. ПРАЎДЗІН.

г. Пінск.

Мастацкае абслугоўванне працоўных у дні свята

Для лепшага мастацкага абслугоўвання працоўных Заходняй Беларусі ў дні святкавання XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР накіроўвае туды рад канцэртных брыгад.

4 лістапада ў Глыбокае выехаў аркестр беларускіх народных інструментаў Дзяржаўнай філармоніі БССР. Разам з аркестрам выехала заслужаная артыстка БССР Аляксеева.

Гарады Пінск і Брэст-Літоўск у дні свята заведае Ленінградскі Дзяржаўны тэатр лялек і марыянетак. У Аўгустоў выязджаюць калектывы мастацкай самадзейнасці клуба заводаў імя Варашылава і імя Кірава.

2 канцэртныя брыгады артыстаў тэатраў Мінска наведаюць гарады Навагрудак і Валкавыск. Чатыры брыгады накіроўвае Белдзяржэстрада для мастацкага абслугоўвання байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі.

„ДЗЕД І ЖОРАЎ“ У ДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭАТРЫ ЛЯЛЕК

Дзяржаўны тэатр лялек паставіў п'есу-казку беларускага пісьменніка В. Вольскага «Дзед і жораў». Як і ў «Пудоўнай дудцы», Вольскі бярэ за аснову фальклорны матэрыял. Тэма п'ес у асноўным супадае. Але ў тым і каштоўнасць фальклорнага матэрыялу, што ён дазваляе незвычайна разнастайна вар'іраваць, распрацоўваць асноўную тэму. Вольскі ўлічыў гэта і стварыў зусім арыгінальную, хаця і пераклікаючуюся па тэме з першай працай, п'есу. У «Пудоўнай дудцы» пастух Янка здабывае ў велікана пудоўную дудку, пад якую пляшуць паны. У п'есе «Дзед і жораў» дзед атрымлівае ад жорава, у адзнаку удзячнасці за свабоду, спачатку торбу-самабранку, а калі войт і пан адбіраюць яе, — дудку, цудоўная ўласцівасць якой заключаецца ў тым, што, затрубіўшы, можна выклікаць здаровых малайцоў, якія «частуюць» пана, войта і папа дубінкамі. П'еса-казка Вольскага,— удзячны матэрыял для лялечнага тэатра. Казачнасць, феерычнасць іменна ў лялечным тэатры могуць знайсці найбольш цікавае, тэхнічна складанае выражэнне.

Добрая п'еса Вольскага атрымала вартае ўвасабленне ў тэатры лялек. «Дзед і жораў» — спектакль вясёлы, займальны, зладжаны. Немагчыма ўтрымацца ад смеху, гледзячы на аб'ясненне дзеда з папом, які прагна выпрошвае цудоўную дудку, не падазраваючы аб прыгатаваных для яго непрыемнасцях.

Спектакль ставіў актор тэатра М. Е. Бабушкін. Гэта яго першы рэжысёрскі вопыт, і вопыт удалы. Спектакль добра-ладжаны, мастацкі, прадуманы і цікавы. Ёсць рад добрых рэжысёрскіх знаходак, выразных мізансцэн. Асабліва добра вырашаны сцэны: дзяўба дзедам жорава ў гароху, смешны эпізод хавання дзеда, аб'ясненне з войтам і панам, з'яўленне торбы-самабранкі. Выдатна пастаўлены і выконваюцца народныя танцы.

Ляльку «дзед» водзіць артыст Л. Н. Новікаў. Сама лялька зроблена надзвычай удала. Вельмі выразны твар дабрадушнага старога барадача. Лялькавод добра распрацаваў характэрныя рысы позы, мовы, смеху.

Ролю «бабы», жонкі дзеда, выконвае арт. Н. І. Олешка. Лялька зроблена няўдала. У твары няма мяккасці. Гэта перашкаджае артыстцы. Найбольш цікавымі і ўдалымі месцамі выканання гэтай ролі з'яўляюцца сцэнкі чакання дзеда, размова з папом, спрэчка з дзедам.

Разыходзіцца з верным акторскім замыслам і тэхнічнае выкананне лялькі «поп». Артыст Струшкін знайшоў цікавыя, тыповыя рысы вобраза ў мове і руках лялькі. Маска-ж папа з вялікім ротам, адтапыранымі губамі, вытарашчанымі вачамі—невыразная, грубая.

Слабым месцам спектакля з'яўляецца лялька «жораў» (арт. Булава). Лялька і мастацка і тэхнічна зроблена дрэнна. Жораў атрымаўся якісьці абшчыпаны, няэграбны, пазбаўлены ўсякай свабоды руху. Тэатру трэба шукаць іншага выражэння гэтага вобраза. Арт. Булавай трэба таксама папрацаваць, пашукаць характэрнага гукапераймання—бурлыкання. Рэзкі візгат, які ўжывае артыстка зараз, трэба зняць. Вельмі каларытна і цікава ўсіх адносінах выконвае ролю лялькі «войт», арт. А. Н. Хутарэцкі.

Спектакль «Дзед і жораў» афармляў мастак Б. Ф. Звенігародскі. Нажаль, афармленне вельмі невысокай якасці, яно натуралістычнае, безгустоўнае, нетэатральнае і, да таго-ж, вельмі неахайна выканана. Тэатр лялек павінен звярнуць сур'ёзную ўвагу на мастацкае афармленне сваіх спектакляў, запрашаць для работы ў тэатры высокакваліфіцыраваных мастакоў.

Спектакль «Дзед і жораў» у тэатры лялек — з'ява вельмі прыемная. Паяўленне гэтага добрага спектакля ў рэпертуары тэатра сведчыць аб тым, што нездаровая атмасфера, не так даўно меўшая месца ў тэатры лялек, зжыта і калектыў тэатра заняты сапраўднай творчай працай. Калектыў павінен цяпер сур'ёзна заняцца вучобай. Тады спектаклі тэатра лялек стануць яшчэ больш культурнымі, цікавымі і мастацка каштоўнымі.

Ан. СЕГЕДЗІ.



Кампазітар Крошнер — аўтар музыкі балета «Салавей».

ВЫСТАЎКА РАБОТ МАСТАКА Ф. ПАРХОМЕНКА

У Магілеве адкрылася выстаўка работ мастака Ф. Г. Пархоменка.

Выстаўка мае на мэце паказаць грамадскасці горада больш чым 50-гадовую працу тав. Пархоменка ў галіне выяўленчага мастацтва.

Работы тав. Пархоменка, якіх налічваецца каля 2-х тысяч, выкананы пяром, акварэллю, пастэллю і інш.

Па тэхатыцы — работы ўсебаковыя. Тут і партрэты правадыроў рэволюцыі, партрэты герояў нашай Чырвонай Арміі, партрэты пісьменнікаў-класікаў. Ёсць жанравыя сцэнкі. Шырока прадстаўлены пейзажы Магілева і іншых гарадоў — Віцебска, Смаленска, Оршы. Вялікае месца ў работах тав. Пархоменка адведзена зарысоўкам мест Заходняй Беларусі.

Варта ўпамянуць і аб тым, што тав. Пархоменка звыш 30 год свайго жыцця аддаў педагагічнай дзейнасці. У гэтай галіне ён працуе і зараз.

Многія работы тав. Пархоменка прыняты камісіяй для першай абласной выстаўкі мастацкай самадзейнасці.

Г. КАЛАТНОВЕР.



Кадр з фільма «Ноч у верасні».

„НОЧ У ВЕРАСНІ“

У пачатку верасня гэтага года краіна адзначала чацвертую гадавіну стаханаўскага руху. Чатыры годы таму назад у шахце Цэнтральная-Ірміно Аляксей Стаханаў паклаў пачатак магутнаму ўсенароднаму руху. На сёнешні дзень на заводах і фабрыках, на калгасных палях,— ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва выраслі сотні тысяч стаханаўцаў, а кінематаграфія выпусціла толькі першы фільм аб стаханаўскім руху.

«Ноч у верасні»—пакуль адзіны фільм аб зараджэнні стаханаўскага руху, вось чаму ён павінен быў выявіць найбольш важныя і яркія бакі гэтай вялікай творчай ініцыятывы. Наколькі ўдалося рэжысёру Барнету і аўтару сцэнарыя Чэкіну справіцца з тымі патрабаваннямі, якія глядач управах прад'явіць да такой адказнай тэмы, як стаханаўскі рух?

Перш за ўсё, трэба паглядзець на сцэнарый фільма. Сцэнарый напісан па аднайменнай п'есе таго-ж аўтара. У многіх адносінах сцэнарый адрозніваецца ад п'есы лепшымі якасцямі. Але самыя істотныя недахопы п'есы перайшлі і ў сцэнарый.

Агульнавядома, што стаханаўская праца—гэта творчасць. Простае павелічэнне фізічнай энергіі на рабоце нічога агульнага з стаханаўскімі метадамі працы не мае. Сам Стаханаў папярэдне прарабіў вялікую рацыяналізатарскую работу, глыбока асвоіў вытворчую культуру працы і толькі пры гэтых умовах быў магчымы яго славуты рэкорд. Ні п'еса, ні фільм, нажаль, не раскрылі гэтай галоўнейшай рысы стаханаўскага руху.

Герой фільма Сцяпан Кулагін нічога асаблівага не прыдумаў і не зрабіў перад сваім рэкордам. Ён проста пачаў працаваць з патроенай энергіяй у забоі і даў за адну змену 14 норм. Не гледзячы на тое, што ў карціне Сцяпан Кулагін працуе наперыста, лезь не падвіжнічаскі аддае сваю сілу адбойнаму малатку,—усё-ж няма ўражання сапраўднай стаханаўскай працы, таму што няма ў ёй творчасці.

Ці патрэбна было аўтарам аналізіраваць падрабязна ўсю тую, часам складаную, тэхналагічную падрыхтоўку, якая абумоўлівае з свайго боку стаханаўскія рэкорды? Зусім не абавязкова. Але самую творчую мысль, нараджэнне гэтай мыслі, вядома, трэба было раскрыць у мастацкіх вобразах. Уласна кажучы, адсюль і пачынаецца вобраз чалавека-творца, вобраз чалавека нашай эпохі.

А Сцяпан Кулагін з'яўляецца толькі пазіцыйным бокам гэтага вобраза, таму што працэс яго творчага выспявання ў карціне абыйдзены. Ці не таму таленавіты артыст Кручкоў не ў сілах быў стварыць жывы пераканаўчы вобраз Сцяпана Кулагіна. Вобраз Кулагіна надзвычай прамалінейны. У ім няма патрэбнага ўнутранага развіцця. Кулагіну ўласціва якаясьці пасіўнасць. Вакол яго сплятаецца цэлая сетка дыверсій, але раскрывае яе сакратар партарганізацыі Лугавой і шахцёрка Дуня, якія, дарэчы, і з'яўляюцца найбольш удалымі вобразамі фільма. Сам Кулагін застаўся ў баку, не гледзячы на тое, што ў першую чаргу ён намячаўся афярай дыверсіі.

Між іншым, уся гісторыя з дыверсіяй займае амаль тры чвэрці фільма. Гэта, вядома, у многім парушыла суадносіны вобразаў. Найбольш вылучаюцца вобразы начальніка шахты—шкодніка Паплаўскага і яго спадручнага — ворага Старкоўскага. Тут аўтары паўтарылі адну з найменш удалых спроб паказу ў кіно шкодніцтва і дыверсій, стаўшы на лёгкі шлях дэтэктыўнага сюжэта.

Вядома, што стаханаўскі рух нараджаўся ў жорсткай класавай барацьбе з варожым ахвосцем, але совецкая кінематаграфія навучылася ўжо інакш паказваць ворага. Прыгадаем, як тонка і глыбока, па-мастацку, ускрыты класавыя ворагі ў карціне «Вялікі грамадзянін» Эрмлера.

Але ў карціне ёсць адна вялікая і непаўторная ўдача. Гэта вобраз Серго Орджанікідзе, створаны засл. арт. рэсп. Абхазіі Ахвледзіані. Не гаворачы ўжо аб выдатным партрэтным падабенстве і ўменні актора перадаць увесь вонкавы выгляд Орджанікідзе, актор з такім-жа ўменнем перадаў і ўнутраны велічны выгляд палкага трыбуна.

У задушэўна-таварыскай гутарцы з парткомам шахты Лугавым Серго натхняе яго на арганізацыю славутага рэкорда Кулагіна. Прыезд Орджанікідзе на шахту ўзняў нябачаны энтузіязм шахцёраў да повага вытворчага ўздыму. Гарачае, чулае сэрца Серго саграваў людзей.

Калі-б, у адпаведнасці з гэтым вобразам, таксама глыбока і цікава была раскрыта тэма зараджэння стаханаўскага руху — фільм быў-бы вялікай удачай совецкай кінематаграфіі. Але цяпер гэта сказаць аб карціне нельга.

К. ГУБАРЭВІЧ.

ПРАГЛЯД БАЛЕТА „САЛАВЕЙ“

3-га лістапада ў Дзяржаўным Беларускім тэатры оперы і балета было асабліва ўрачыста і радасна. Тэатр паказаў падрыхтаваную ім да XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі прэм'еру першага беларускага балета «Салавей» М. Крошнера.

Лібрэта балета напісана Ю. Сланімскім і А. Ермалаевым па матывах аднайменнай аповесці Змітрака Бядулі. Спектакль пастаўлен заслужанымі артыстамі РСФСР Ф. Лапуховым і ордананосцам А. Ермалаевым, мастацкае афармленне Б. Матруніна. Дырыжор М. Шнейдэрман.

Галоўныя партыі ў балеце выканалі: партыю Сымона — вядучы саліст С. Дрэчын, Зоські — заслужаная артыстка рэспублікі А. Нікалаева, Ванды — заслужаная артыстка рэспублікі З. Васільева і Макара — С. Бабаін-Ордынскі.

На праглядзе прысутнічалі сакратары ЦК КП(б)Б тт. Грэкава і Малін, народныя камісары, пісьменнікі, мастакі, артысты і прадстаўнікі друку.

Прагляд прайшоў з велізарным поспехам. Прысутныя на спектаклі ўзнагародзілі бурнымі воплескамі артыстаў, аўтараў і пастаноўшчыкаў спектакля за мастацка выкананыя сольныя, ансамблевыя і масавыя танцы, за сімфанічную і танцавальную музыку, за свежасць і навізну рэжысуры.

5-га лістапада — першы спектакль «Салаўя».

ПІСЬМЕННІКІ РЫХТУЮЦЦА ДА ВЫБАРАЎ

Пісьменнікі Совецкай Беларусі ўключаюцца ў актыўную падрыхтоўку да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Таварышы Агняцвет, Шынклер, Баумволь працуюць агітатарамі на выбарчым участку. Яны праводзяць заняткі з хатнімі гаспадынямі.

Нядаўна на выбарчым участку адбыўся сход хатніх гаспадынь, на якім тав. Модаль зрабіў даклад аб міжнародным становішчы.

Партыйная арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў арганізуе на выбарчым участку агітацыйны пункт. Зараз партарганізацыя рыхтуе на ўчастку вечар хатніх гаспадынь, прысвечаны XXII гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі.

***

Пастановай Аргкамітэта Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР па Мінскай вобласці паэт-ордананосец тав. П. У. Броўка зацверджан членам Мінскай гарадской выбарчай камісіі па выбарах у Советы дэпутатаў працоўных.

Літаратурны вечар

2 лістапада ў мінскім Доме Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава сустрэліся на вечары камандзіры і палітработнікі Мінскага гарнізона з совецкімі пісьменнікамі — байцамі, удзельнікамі паходаў у Заходнюю Беларусь.

Пісьменнік тав. А. Ісбах у сваім дакладзе падкрэсліў тое, што совецкія пісьменнікі ўмеюць ваяваць супроць ворагаў не толькі пяром, але і зброяй. Тав. Ісбах расказаў некалькі баявых эпізодаў, у якіх пісьменнікі непасрэдна ўдзельнічалі, будучы камандзірамі і палітработнікамі.

З чыткай сваіх твораў на вечары выступілі маскоўскія паэты-ордананосцы тт. В. Лугаўской, Е. Далматоўскі, пісьменнікі А. Ісбах, Б. Левін, паэты тт. І. Франкель, М. Кручкін і беларускія паэты тт. А. Куляшоў і А. Астрэйка.

М. П.

ДОБРАЯ КАЗКА*)

У беларускай літаратуры для дзяцей мала ёсць добрых паэтычных твораў. Мы маем на ўвазе літаратуру для дзяцей малодшага ўзросту. Сярод нямногіх апошніх твораў звяртае на сябе ўвагу незаслужана абыйдзеная крытыкай казка Я. Герасімовіча «Верабейчык».

Казка радуе чытача непасрэднасцю і прастатой. Аўтару ўдалося цікава скарыстаць фальклор. Сама будова верша напамінае цікавую народную песню. У гэтым лёгка ўпэўніцца, калі пазнаёміцца з наступнымі радкамі:

«Раз улетку на цямочку
Паляцеў ён ад дамочку
Недалёка і не блізка,
Не высока і не нізка»...

Або:

«Доўга нёс мо' ці мала,
Нам зязюля не сказала,
Не сказала і сава,
Бо такая і сама.
Не сказала і сарока,
Бо была яна далёка»... і г. д.

Для казкі ўласцівы разнастайныя рытмы, якімі аўтар даволі ўмела валодае. Пераходы ад аднаго рытму да другога, за рэдкімі выключэннямі, не псуюць добрага ўражання.

Казка поўна шчырага народнага гумару, асабліва ў тым месцы, дзе «птушкі-весялушкі» паехалі зваць папа-клапа на пахаванне прапавітага верабейчыка. Пражэрлівы поп не хоча ехаць за малы падарунак, і вось як яго просяць:

«Не марудзь ты, едзьма,
Твая жонка ведзьма.

Не слухай дзячыхі —
Чорнае скачыхі.» і г. д.

Або ў другім месцы, дзе апісваецца, як фурман-таракан і блыха вязуць папа-клапа:

«Я вязу на вазу
Не авечку, не казу,
Гоп, гоп, гоп-па-па,
Я вязу сабе папа.
. . . .
Едзе поп на блысе
У чырвоным кажусе»...

Але поп-крывасмок па дарозе вахапеў яшчэ большай узнагароды. Тады «заладвалі госці на дзіравым мосце» і, памераўшы рэчку, укінулі ў яе папа.

Поп-крывасмок адзначан традыцыйнымі рысамі фальклора. Іменна такога папа мы і прывыклі сустракаць у народнай творчасці.

Вельмі ўмела і вельмі да месца многія гукападражанні. Напрыклад:

«Шіў-віць, ціў-віць, ціў-віць-віць, —
Перапёлачка крычыць»...
«Цілям-цілям-цілям-балы, —
Селі мухі за цымбалы»... і шмат інш.

Выдатна апісаны радасныя скокі герояў казкі. Гэта адны з самых лепшых старонак кніжкі. Нельга не прывесці захапляючы канец казкі:

«Вось на печы, на куце,
Муха лапці пляце,
Тчэ красёнцы павук,
Робіць крупы пацук.
. . . .
Жук аладкі пячэ,
Шашаль дровы сячэ,
Матыль возіць,
Пчолка носіць,
Трушень памагае,
А музыка без языка,
На скрыпачцы іграе».

Як недахоп казкі трэба адзначыць некаторыя няўдалыя выразы і штучныя словы ў ёй, напрыклад: «Паданне».

Афармленне кніжкі шэрае і неахайнае. Не гледзячы на гэта, маленькія чытачы атрымалі цікавы, вясёлы твор.

А. КОРШАК.
М. АЎРАМЧЫК.

*) Я. Герасімовіч, «Верабейчык», ДВБ. 1939 г.

МАЛАДАЯ ПРОЗА

Новае пакаленне празаікаў прышло ў беларускую літаратуру на працягу апошніх трох-чатырох год. Тры-чатыры гады для літаратурнага фарміравання пісьменніка час далёка яшчэ не дастатковы, аднак, можна ўжо гаварыць пра маладую прозу, як пра пэўную у асноўным удачу маладога літаратурнага пакалення.

Па-першае, усіх маладых празаікаў прыемна адрознівае іх сучасная, блізкая нашаму жыццю тэматыка. Яны бяруць жыццё такім, як яно ёсць, як наглядаюць яны яго штодзённа, з героямі, з якімі сустракаюцца на сумеснай працы, з якімі сябруюць, якіх любяць. Жывы, лёгкі гумар уласцівы ім, калі адзначаюць яны чалавечую слабасць сваіх герояў. Гумар гэты звычайна не злосны, добры і радасны. І таму ён надае яшчэ больш пераканальнасці творам, больш тыповасці героям. У гэтых адносінах адрозніваюцца ад іншых сваімі апавяданнямі Ус. Краўчанка, Ул. Кандраценя, А. Алешка. Пішуць яны пра каханне, пра новыя адносіны да працы, пра новыя адносіны чалавека да чалавека, адным словам, пра ўсё тое, што ў агуле вызначае фарміраванне новага чалавека, на новай зямлі і ў новым грамадстве.

Самым пладавітым з пералічаных маладых пісьменнікаў з'яўляецца бясспрэчна Ус. Краўчанка. Ён выдаў ужо некалькі кніжак сваіх твораў—у асноўным кароткіх апавяданняў на бытавыя тэмы. — і рэгулярна і часта друкуе апавяданні ў часопісу «Полымя рэволюцыі», а больш у газеце «Большэвік Палесся», у якой ён працуе.

Ул. Кандраценя выдаў зборнік «Любоў», у які ўвайшлі яго аповесць пад тою-ж назвай і апавяданні. Ул. Кандраценя — настаўнік, ён цесна звязан з нашым жыццём.

А. Алешка надрукаваў за апошнія гады рад апавяданняў у часопісу «Полымя рэволюцыі». Гэтыя апавяданні з большага адрознівае мяккасць пачуцця, нават лірыкі, рамантычнае, але зусім законамернае апаэтызіраванне новай маладой жанчыны. Сын селяніна са Случчыны — ваенны работнік — ён добра ведае пра тое, што піша, ён прыслухоўваецца да жывой народнай мовы.

Творы Ів. Грамовіча, Мік. Ткачова і П. Дудо паказваюць нам людзей, у свядомасці якіх адбываецца барацьба з перажыткамі капіталізма. Іх творы насычаны барацьбой з рэшткамі ліквідаваных эксплаататарскіх класаў. На апошнюю тэму і напісана Ів. Грамовічам яго аповесць «Чужы грунт».

Павел Леванові піша апавяданні для дзяцей пра жыццё звяроў і жывёлы, пра беларускую прыроду. Апавяданні гэтыя невялікія памерам і бадай усе яны друкуюцца ў дзіцячых часопісах і газетах. Трэба сказаць, што дзецьмі ўключна да старэйшага ўзросту чытаюцца яны з цікавасцю, а гэта ўжо добрая адзнака.

Аднак, малюнак літаратурнага жыцця на Беларусі ў яго маладых парастках, у прыватнасці па прозе, быў-бы няпоўным, калі-б не сказаць, што растуць і развіваюцца маладыя пісьменнікі, якія пішуць на рускай мове. Тут ніяк нельга не адзначыць маладога і таленавітага пісьменніка Зубца, апавяданне якога «Максшынскія любіцелі» ў перакладзе на беларускую мову надрукавана ў 5—6 нумары «Полымя рэволюцыі» за гэты год. Апавяданне сведчыць пра добры мастацкі густ яго аўтара.

Фарміраванне пісьменніка не ўкладваецца ў рамкі трох-пяці, а нават і дзесяці і больш год. Такім чынам, нельга казаць пра маладую прозу нашае рэспублікі, як пра нешта канчаткова аформленае, што мае свае сталыя фармальныя адзнакі. Усе таварышы без выключэння яшчэ ў пошуках самых сябе. Яны пад моцным уплывам іхніх любімых пісьменнікаў — класікаў ці сучасных.

Пад канец трэба адзначыць, як добрую з'яву, прыслухоўванне маладых пісьменнікаў да жывой беларускай мовы, што для кожнага пісьменніка павінна быць законам, а не пажаданнем. Праўда, гэтае прыслухоўванне мае яшчэ прымітыўны характар. Іх вока яшчэ не ў змозе ахапіць усяго багацця фарбаў, якімі блішчыць вусная народная творчасць беларусаў. Але яны напэўна авалодаюць гэтымі багаццямі. Усе магчымасці для гэтага забяспечаны існаваннем совецкага ладу, умовамі, якія соцыялістычнае грамадства стварае для маладых талентаў народа.

Р. МУРАШКА.



Балет «Салавей» у тэатры Оперы і балета БССР. Саліст **С. Дрэчын** у ролі Салаўя (Сымон), засл. арт. рэсп. **А. В. Нікалаева** ў ролі Зоські.

Фота І. Каплінскага.

КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ ВЫКАНАННЕ ЛІТАРАТУРНЫХ І МУЗЫКАЛЬНЫХ ТВОРАЎ

У Магілеве з поспехам прайшоў абласны конкурс на лепшае выкананне літаратурных і музыкальных твораў, арганізаваны абласным аддзелам мастацтва і Домам народнай творчасці. У конкурсе ўдзельнічала 104 чалавекі—калгаснікі, рабочыя, прадстаўнікі інтэлігенцыі. Многія з выканаўцаў атрымалі выдатныя і добрыя ацэнкі журы. Сярод іх: студэнткі Горацкага сельгасінстытута тав. Панова (спевы) і Драйчык (мастацкае чытанне), студэнтка Магілеўскага педінстытута дэкламатар Гусакова, работнік аддзела сувязі Магілева—балалаечнік Ліпкін, рабочы ст. Магілева—баяніст Стануліс, работніца магілеўскай бальніцы тав. Чарняўская (спевы), секстэт домр Дома народнай творчасці і інш.

Для ўдзельнікаў конкурса былі зроблены даклады аб музыцы, спевах, драматургіі, мастацкаму чытанню і дана кансультацыя.

Я. ШЧАРБАТАЎ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Уп. Галоўлітбела № Р—2030.